

Ці прынясе «тэрмафутра» выгаду вашаму кашальку?

СТАР. 2



Каб фінансы не пелі рамансы...

МС




Куды запрашае Уладзімір Співакоў?

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 лютага 2014 г. СЕРАДА № 31 (27641) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ІГРАЦЬ З ДЗЯРЖАВАЙ НЕДАПУШЧАЛЬНА

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка перасцерагае прадпрымальнікаў ад шантажу ўлады ў сувязі са змяненнем умоў іх работы. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў на нарадзе па праекце ўказа «Аб некаторых пытаннях рэалізацыі тавараў індывідуальнымі прадпрымальнікамі і іншымі фізічнымі асобамі», перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Некаторыя палітыкі ад прадпрымальніцтва, хоць іх цяжка назваць палітыкамі, якія прадстаўляюць інтарэсы прадпрымальнікаў, спрабуюць шантажыраваць уладу, у тым ліку Прэзідэнта. Вось чаго я не раіў бы, дык рабіць такія заявы ў сродках масавай інфармацыі, паколькі гэта можа проста праз бок вылезці. Мяне палохаць дарэмна. Майдана мы не дапусцім у нашай краіне», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ўсё будзе цывілізавана, паколькі прадпрымальнікі — самы прагрэсіўны слой грамадства, арыентаваны на ўсялякія рэформы. «Таму, калі вы хочаце жыць, як, дапусцім, на Захадзе, мы вам прадаставім такія ўмовы. Калі вы хочаце жыць, як на майдане, — прабачце за гэта ўпамінанне, я ні ў якім выпадку не хачу ўмешвацца ва ўнутраныя справы Украіны, проста добрае параўнанне, — гэта не ў Беларусі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Я ведаю, вы людзі нябедныя і можаце заказаць у жоўтай прэсе любы артыкул, але вам раю гэтага не рабіць, таму што можна атрымаць адваротную сітуацыю. І ганіце ад сябе ўсялякіх там Шумчанкаў, не то яшчэ кагосьці, каб яны нават блізка каля вас не хадзілі. У іх няма нічога з вамі агульнага і быць не можа, ім патрэбна іншае», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што рашэнне будзе прынята зыходзячы з выгады, па-першае, для спажыўцоў, гэта значыць беларускага народа, па-другое, для беларускай дзяржавы, і па-трэцяе, для прадпрымальнікаў. Кіраўнік дзяржавы прызнаў цяжкай іх працу. «Гэта ж трэба ехаць у Маскву, перад кімсьці стаяць на каленях, у сумках сюды везці тавар, дамаўляцца там аб нейкіх скідках, каб цэны былі прымальнымі, потым і ў мароз, і ў сцюжу, і ў гарачыню прадаваць яго тут. Гэта цяжкая работа, тут я перад вамі не ліслівую, і, напэўна, яна вас задавальняе. Я не супраць. Але ўсё павінна быць цывілізавана», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што іграць з дзяржавай, прапаноўваючы адтэрмінаваць прыняцце рашэнняў, недапушчальна. «Ніякіх часовых палавінчатых рашэнняў тут быць не павінна. Мы і так іх прынялі шмат», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што, перш чым падпісаць указ, хацеў бы ўбачыць глыбіню працэсаў, што адбываюцца ў прадпрымальніцкім асяроддзі. «Калі гэта людзі, якія перабіваюцца з вады на хлеб, чаго мы да іх чапляемся?! Калі ж гэтыя людзі супербагатымі сталі і могуць чымсьці падтрымаць дзяржаву, мы іх папросім, каб яны, разбагацеўшы, стаўшы на ногі за кошт беларускага народа і дзяржавы, паколькі спажыўцамі з'яўляюцца яны, крыху падзяліліся з дзяржавай», — сказаў Прэзідэнт.

«Мне патрэбна не знешняя матывацыя: вось Мытны саюз, давайце накінем пятлю на шыю часткі беларускага народа. Мне такі Мытны саюз не патрэбны, дзе мы будзем накідваць петлі людзям, якія сёння працуюць», — дадаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што размова ідзе аб 60 тыс. індывідуальных прадпрымальнікаў, якія займаюцца ўвозам і рэалізацыяй тавараў. Ён нагадаў, што ў 2005 годзе, сустракаючыся з прадпрымальнікамі на адным з рынкаў у Мінску, была дасягнута дамоўленасць аб тым, як будуць працаваць індывідуальныя прадпрымальнікі, быў прыняты спецыяльны ўказ, які дзейнічае да гэтай пары. У той жа час, паводле слоў Прэзідэнта, прадпрымальнікам з-за знешніх абставін стала нібыта немагчыма працаваць у гэтым фармаце. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што хацеў бы разабрацца ў гэтым пытанні, атрымаць ад удзельнікаў нарады дастаткова інфармацыі для таго, каб прыняць канчатковае рашэнне.

### ПРАМАЯ ЛІНІЯ

### УСЁ ПРА АДРАСНУЮ САЦЫЯЛЬНУЮ ДАПАМОГУ

**Хто мае права на штомесячную або аднаразовую сацыяльную дапамогу і якія сёння іх памеры? Ад чаго яны залежаць? Каму прызначаецца дапамога па аплаце паслуг ЖКГ? Колькі разоў можна звярнуцца па дапамогу на падгузкі?..**

Гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце задаць **намесніку міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандру Аляксеевічу РУМАКУ** ў ходзе прамой тэлефоннай лініі **«Падтрымка насельніцтва праз сістэму дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі»**, якая адбудзецца ў рэдакцыі «Звязды» 20 лютага. Тэлефануйце па нумары **(8-017) 287 18 66 з 11 да 12 гадзін.** Папярэднія пытанні можаце задаваць па тэлефоне **(8-017) 292 21 03.**

## ЛЕЛЬЧЫЦКІ «КАЎБОЙ»



**Амаль трыццаць гадоў Міхаіл Аляксеевіч Ашарчук працуе апператарам па штучным асемяненні на малочнатаварнай ферме ў вёсцы Дзяржынск Лельчыцкага раёна. Яго клопатам тут створаны высокапрадукцыйны статак з больш як 550 кароў, і сярэднія надоі ад іх — каля пяці тысяч літраў малака. А гэта адзін з найлепшых паказчыкаў у раёне.**

**— Па сумяшчальніцтве мне даводзіцца працаваць яшчэ і ветэрынарам. Таму кожная рагуля — і на ферме, і ў прыватным сектары — ведае мяне, пазнае, ахвотна ідзе да рук, даецца агледзець, — кажа Міхаіл Аляксеевіч.**

**Жывёлагадоўля, дарэчы, — гэта ў яго сямейнае: на ферме працавала маці, працуюць брат, сястра, а таксама жонка.**

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Настаяцель мінскага праваслаўнага прыходу храма-помніка ў гонар Усіх Святых протаіерэй Фёдар ПОЎНЫ:**

***«Думаю, што спартсмены маюць для грамадства каласальнае значэнне, асабліва ў наш час, таму што гэта ўвасабленне нашай краіны, нашага народа, нашага грамадства. Хто б што ні казаў, але гэта заўсёды твар краіны. Калі паднімаецца сцяг падчас уручэння ўзнагароды — гэта асаблівае пачуццё, да якога нельга прывыкнуць не толькі спартсмену, але і наогул прадстаўнікам краіны».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.02.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9710,00 | ■ |
| Еўра | 13310,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 275,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1087,96 | ▼ |

■ Асабістая бяспека

## «ПАЛЯВАННЕ» НА ЗЛОДЗЕЯ

Як абараніць сваю маёмасць, не парушыўшы пры гэтым закон і не рызыкуючы здароўем

**Аднойчы ў электрычцы пачуў вельмі цікавую гісторыю. Два пажылыя чалавекі абмяркоўвалі між сабой, як найлепш абараніць свае дачы ад аматараў да чужога дабра. Адзін з іх прыгадаў падзеі з уласнага жыцця. Яшчэ ў савецкі час ён быў мараком далёкага плавання, таму адсутнічаў дома па некалькі месяцаў запар.**

Само сабой, яго жыллё як магнітам прыцягвала да сябе зладзеяў. Пасля двух абрабаванняў ён усталяваў... гудок са спісанага карабля, каб адпужваць з яго дапамогай няпрошаных гасцей і, калі што, «ставіць на вушы» ўвесь пад'езд. Механізм пуску спрацоўваў пры несанкцыянаваным адчыненні дзвярэй. Ды відавочна перастараўся чалавек: двое зладзеяў з-за вялікай магутнасці гуку аглухлі на месцы. За гэта давялося гаспадару адказаць перад законам. Але як — гэта так і засталося загадкай. Цягнік падкаціў да патрэбнай станцыі...

А яшчэ раней дзесьці пачуў пра тое, як некаторыя «вынаходлівыя» аўтааматары дагэтуль ставяць капканы побач з педаллю газа. Зусім як у легендарнай стужцы «Сцеражыся аўтамабіля»... Ды вось толькі з-за такога ціхага палявання на «дзетачкіных» можа ў рэшце рэшт мець вялікія праблемы сам гаспадар.

СТАР. 3

■ Ведай нашых!

## «ПЛАЦДАРМ» — ЛЕПШЫ ПРАЕКТ АБ УЗБРОЕНЫХ СІЛАХ

**Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства абароны «Плацдарм» прызнаны лепшым спецыяльным праектам аб Узброеных Сілах краіны. Дыплом першай ступені ўручылі выданню падчас цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў штогадовага творчага конкурсу на лепшае асвятленне ў СМІ пытанняў будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл Беларусі, патрыятычнага выхавання насельніцтва.**

Вось ужо на працягу сямі гадоў запар на падвядзенне вынікаў збіраюцца лепшыя прадстаўнікі айчыннай журналістыкі — усе тыя, хто сваёй штодзённай працай дамогся перамогі ў прэстыжным рэспубліканскім конкурсе. Конкурсе, які прапагандуе непахісныя традыцыі нашага народа: любоў да Радзімы, гатоўнасць і ўменне яе абараняць.

— Сёння мы маем права казаць аб высокай эфектыўнасці і выніковасці супрацоўніцтва Узброеных Сіл і сродкаў масавай інфармацыі ў пытаннях ваеннага будаўніцтва і ваенна-патрыятычнага выхавання, — зазначыў **міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Юрый ЖАДОБІН.** — Больш за 3 тысячы публікацый у друкаваных СМІ, каля 100 гадзін тэле- і каля 150 гадзін радыёвяшчання штогод прысвячаецца Узброеным Сілам, людзям, адданым справе абаронца Айчыны.

Пераможцы былі вызначаны ў 17 творчых намінацыях, якія ахапілі ўвесь спектр інфармацыйнай дзейнасці, усе сучасныя жанры, формы і спосабы асвятлення ваенна-патрыятычнай тэматыкі.

— Сёлета для ўдзелу ў творчым конкурсе былі пададзены 73 заяўкі ад сродкаў масавай інфармацыі Рэспублікі Беларусь, што значна больш, чым летась, — падкрэсліў **памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны генерал-маёр Аляксандр ГУРА.** — Прычым журы адзначыла не толькі ўзрастаючую актыўнасць рэгіянальных СМІ, а і пашырэнне геаграфіі ўдзельнікаў конкурсу.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Дыплом І ступені атрымлівае вядучая праекта «Плацдарм» спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Вераніка КАНЮТА.

Трэба сказаць і пра высокі прафесіяналізм і адказнасць журналістаў у асвятленні ваеннага будаўніцтва і ваенна-патрыятычнага выхавання.

Па словах **намесніка міністра інфармацыі Дзмітрыя ШАДКО,** у ваенна-патрыятычным выхаванні асаблівая роля належыць сродкам масавай інфармацыі. «Цешыць, што наш конкурс па праве заваяваў аўтарытэт і павагу ў журналісцкім асяродку. Пастаянны рост колькасці яго ўдзельнікаў сведчыць аб высокай грамадскай значнасці Узброеных Сіл і цікавасці беларусаў да пытанняў іх функцыянавання і развіцця», — адзначыў намеснік міністра.

**Ніка МАЙСКАЯ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЕГІПЕЦКІЯ ІСЛАМІСТЫ ПАРАІЛІ ТУРЫСТАМ ПАКІНУЦЬ КРАІНУ

Егіпецкая ісламісцкая групоўка «Ансар Бейт аль-Макдыс» папярэдзіла замежных турыстаў аб непажаданасці іх знаходжання на тэрыторыі краіны пасля 20 лютага, паведамляе Reuters. Ісламісты, якія прызналіся ў нядаўнім падрыве аўтобуса з паўднёвакарэйскімі пілігрымамі каля ізраільскай мяжы, параілі замежнікам пакінуць краіну, «пакуль яшчэ не занадта позна».

### ЗША ЛЕТАМ 2014-га ПАЧНУЦЬ АБСТАЛЁЎВАЦЬ ВАЕННЫЯ КАРАБЛІ ЛАЗЕРНЫМІ ГАРМАТАМІ

Узброеныя сілы ЗША пачнуць абсталёўваць свае караблі лазернымі гарматамі летам 2014 года. Першы ўзор гэтага новага віду зброі з'явіцца на дэсантным караблі «Понсэ», які зараз знаходзіцца ў Персідскім заліве. Лазерная зброя прызначана для ліквідацыі беспілотнікаў і быстраходных лодак. Акрамя лазера, амерыканскія вайскоўцы таксама плануюць выпрабаваць на вадзе электрамагнітную гармату. Яна страляе снарадамі, якія развіваюць хуткасць у шэсць-сем разоў вышэйшую за хуткасць гуку. Такі від зброі, як адзначае AP, здольны нанесці сур'ёзны ўрон караблю праціўніка. Што тычыцца лазернай зброі, то яе перавагі заключаюцца ў тым, што кіраваць такімі гарматамі можа ўсяго адзін чалавек. Да таго ж кошт эксплуатацыі лазернай зброі нашмат ніжэйшы за цану выкарыстання традыцыйных відаў узбраенняў. Напрыклад, запуск адной ракеты-перахватчыка ацэньваецца прыкладна ў 1,4 млн долараў, у той час як стрэл з лазернай гарматы абыдзецца ўсяго ў некалькі долараў.

ISSN 1990 - 763X

14031

9 771990 763008

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### У КІЕВЕ АДНАВІЛІСЯ БЕСПАРАДКІ



Ледзь бакі ўкраінскага палітычнага канфлікту здолелі, як здавалася, стварыць аснову для вядзення далейшых мірных перамоў аб выхадзе з крызісу (узяць хаця б абвешчаную амністыю), як сітуацыя ў цэнтры Кіева зноў абвастрылася. Усё пачалося з мірнага, як паведамлялася, маршу актывістаў Майдана ў бок ўрадавага квартала. На падыходзе да вуліцы Грушэўскага сітуацыя змянілася. Пратэстоўцы падышлі да парламента з боку Крапаснога завулка і вуліцы Шаўкавічнай і пачалі разбіраць брук. Таксама паведамляецца, што актывісты падпалілі два грузавыя аўтамабілі «КамАЗ», якія блакіравалі праезную частку. Мітынгоўцы пачалі запускаць «фаеры» і кідаць камяні і петарды ў бок супрацоўнікаў міліцыі. Згодна з паведамленнем іншых агенцтваў, актывісты, апроч іншага, закідвалі міліцыю «кактэйлямі Молатава». Адначасна актывісты апазіцыі атакавалі кіеўскі офіс Партыі рэгіёнаў. Як паведамляе УНІАН, каля 200 мітынгоўцаў штурмавалі офіс, размешчаны на вуліцы Ліпскай. Актывісты закідвалі будынак «кактэйлямі Молатава», разбілі шкло ў вокнах і некалькі машын, прыпаркаваных побач. У адказ на такія дзеянні ў пратэстоўцаў паляцелі шумавыя гранаты. Сілавікі, па некаторых звестках, таксама выкарысталі гумовыя кулі.

«Байцы ўнутраных войскаў атрымалі цялесныя пашкоджанні, калі актывісты так званага Еўрамайдана незаконна завалодалі адным з грузавых аўтамабіляў і пачалі рухацца ў бок Вярхоўнай Рады», — паведамляе прэс-службы МУС. Па звестках міліцыі, сярод супрацоўнікаў правапарадку ў другой палове дня было ўжо сямёра пацярпелых.

У той жа час каля будынка Вярхоўнай Рады праходзіў мітынг Партыі рэгіёнаў, на якім гучалі заклікі «спыніць нацыяналізм і фашызм» і «падтрымаць Віктара Януковіча». Са сцэны праўладнага мітынгу было абвешчана аб мабілізацыі. Вядучы заклікаў мужчын, здольных аказаць супраціўленне, перамясціцца на левы фланг, «каб падтрымаць прысутных там салдат» унутраных войскаў.

### КОРАТКА

У 2013/2014 навучальным годзе ў дзённых установах агульнай сярэдняй адукацыі на беларускай мове вывучаюць усе прадметы больш як 142 тыс. навучэнцаў, што складае 15 працэнтаў школьнікаў, на рускай мове — амаль 786 тыс. (85 працэнтаў). Ва ўстановах дашкольнай адукацыі выхавальнікі размаўляюць на беларускай мове больш чым з 45 тыс. дашкольнікаў, што складае 11 працэнтаў наведвальнікаў гэтых устаноў, на рускай мове — з 362 тыс. дзяцей (89 працэнтаў).

У Беларусі дазволены продаж айчынных тавараў па цэнах, ніжэйшых за сабекошт. Дакумент распрацаваны ў мэтах паскарэння абарачальнасці запасаў гатовай прадукцыі (тавараў) і грашовых сродкаў. Ён уступае ў сілу пасля афіцыйнага апублікавання і дзейнічае да 1 студзеня 2015 года.

У свеце мужчын крыху больш, чым жанчын. Так мужчынскае насельніцтва пераважае ў Кітаі, Індыі, Турцыі. У Беларусі ж на пачатак 2014 года колькасць мужчын склала 4 млн 401,3 тыс. чалавек, або 46,5 працэнта ад агульнай колькасці насельніцтва. Аднак ёсць гарады, дзе мужчын больш, чым жанчын. Гэта Шклоў, Клічаў, Горкі. Пры гэтым сярэдні ўзрост беларускіх мужчын — 37 гадоў. Ён на 5,2 года меншы, чым сярэдні ўзрост жанчын.

## ГАРАЧЫЯ. ЗІМОВЫЯ... НАШЫ!

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў члена нацыянальнай каманды Беларусі па фрыстайле Антона Кушніра з заваяваннем залатога медаля на Алімпійскіх гульнях у Сочы. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

*«Дарагі Антон! Сёння табой упісана новая старонка ў гісторыю сусветнага спорту. Да гэтага поспеху ты прыйшоў праз гады цяжкіх трэніровак і выпрабаванні, якія выпалі на тваю долю. Уся краіна з заміраннем сэрца перажывала за цябе, і ты падарыў нам свята. Алімпійскія гульні ў Сочы запомняцца сапраўдным трыумфам беларускай школы фрыстайла! Дзякуй за гэта ўсяму калектыву нацыянальнай каманды! Жадаю моцнага здароўя і далейшых поспехаў»,* — гаворыцца ў віншавальнай тэлеграме кіраўніка дзяржавы.




**Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Анатоль Сланеўскі перадае з алімпійскай сталіцы**



Фотаздымкі БЕЛТА.

**...А ўсё магло скласціся інакш. З горных вяршынь спусціўся густы шэры туман, які не дазволіў правесці мужчынскі мас-старт.**

Усіх турбавала пытанне: што будзе з жаночым мас-стартам (гонкай, якую так любіць Даша Домрачава) і ці выступяць фрыстайлісты ў экстрым-парку «Ружа Хутар»? Бо ён размешчаны яшчэ вышэй, чым шчаслівая для нас біятлонная «Лаура». Алімпійцы ж — таксама жывыя людзі, і яны могуць банальна «перагарэць», чакаючы старту, які адкладваецца невядома наколькі...

Нябёсы злітаваліся: літаральна за дзве гадзіны да мяркуемага біятлоннага старту суддзі заявілі, што пытанне аб пераносе жаночай гонкі больш не стаіць.

Што адбывалася далей — вы, спадзяюся, бачылі. Як і ў першай «залатой» для Дашы гонцы, саперніцы нават не ўбачылі яе спіны на фінішы: разрыў больш як 20 секунд — цэлая вечнасць для гонкі такога ўзроўню і напалу.

СТАР. 6

■ Грамадзянская пазіцыя

# МОМАНТ ІСЦІНЫ

## Ідучы на выбары, чалавек вызначае сваю будучыню, будучыню сваёй сям'і і краіны

**Семінар ідэалагічнага актыву Віцебскай вобласці па тэме «Роля ўстаноў сацыяльнай сферы і ідэалагічнага актыву вобласці ў падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў» прайшоў учора ў Оршы. У рабоце семінара прыняў удзел першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Радзькоў.**



Фота БЕЛТА.

«Выбары — адказны момант для кожнага чалавека, — заявіў Аляксандр Радзькоў падчас сустрэчы з моладдзю Аршанскага раёна, якая ўпершыню прымае ўдзел у выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў. Выбары — гэта заўсёды момант ісціны, адказны момант у жыцці кожнага чалавека, бо сваім выбарам ён вызначае сваю будучыню, будучыню сваёй сям'і, краіны. Таму кожны, прымаючы рашэнне, павінен падыходзіць да гэтага свядома і вельмі адказна».

Каментуючы журналістам сустрэчу з моладдзю, Аляксандр Радзькоў падкрэсліў, што атрымаў глыбокае задавальненне ад яе. «Добрыя, талковыя, з імі хочацца гаварыць. Яны вызначалі, якім павінен быць дэпутат. Мы прыйшлі да высновы, што ён павінен быць аўтарытэтам па жыцці, па дзяржаўнай пазіцыі, бо толькі аўтарытэтнаму чалавеку можна даверыць прымаць рашэнні ў рэгіёне, вобласці, краіне. Моладзь усведамляе адказнасць за свой выбар», — адзначыў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Аляксандр Радзькоў таксама падкрэсліў, што семінар у Оршы паказаў, што ў любым месцы, на любым участку прысутнічае ідэалогія. «Нават калі ты просты добрасумленны спецыяліст, які стаіць ля станка, ты разумееш, што павінен якасна выконваць сваю працу, нясеш за гэта адказнасць. У гэтай адказнасці і заключаецца ідэалогія. Сёння з моладдзю мы абмяркавалі, кім яны хочуць працаваць, якой бачаць сваю будучыню. Чаму я пра гэта кажу? Таму што такія семінары, кантакты вельмі важныя для ідэолагаў, таму што ў ходзе такіх мерапрыемстваў яны бачаць, як рэалізуюцца тыя ці іншыя навацыі, як вядзецца праца з людзьмі», — дадаў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі. Ён адзначыў, што вопыт правядзення такіх семінараў абавязкова будзе выкарыстаны пры правядзенні палітычнай кампаніі ў 2015 годзе.

Адказваючы на пытанне аб рэгіянальных СМІ, Аляксандр Радзькоў выказаў думку, што яны павінны развівацца. Паводле яго слоў, мясцовыя раённыя газеты з устойлівым тыражом, раённае тэлебачанне патрэбны, бо адлюстроўваюць падзеі, якія адбываюцца непасрэдна ў гэтай мясцовасці і закранаюць менавіта мясцовых жыхароў. Такімі навінамі жыхары таго ці іншага рэгіёна заўсёды будуць цікавіцца. «Гэта іх ніша, таму за кошт цікавасці мясцовых жыхароў рэгіянальныя СМІ заўсёды будуць выйграваць», — падкрэсліў Аляксандр Радзькоў.

У семінары таксама прынялі ўдзел намеснік міністра інфармацыі Беларусі Уладзімір Матусевіч, першы сакратар ЦК БРСМ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ігар Бузоўскі, работнікі ідэалагічнай вертыкалі мясцовых органаў улады, намеснікі кіраўнікоў па ідэалагічнай рабоце буйных прадпрыемстваў і арганізацый вобласці.

Прысутныя на семінары прынялі ўдзел у працы брыфінг-клуба моладзі Аршанскага раёна «Я — беларус», азнаёміліся з працай новай лядовай арэны ў Оршы.

**Паводле паведамленняў БЕЛТА**

■ Ва ўрадзе

# ПРЭМ'ЕР-МІНІСТР РОБІЦЬ СТАЎКУ НА МАЛАДЫХ КІРАЎНІКОЎ І ПАТРАБУЕ СМЕЛАСЦІ

## САЎМІН АГУЧЫЎ ВЫНІКІ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ КРАІНЫ Ў 2013 ГОДЗЕ

**Пасяджэнне Савета Міністраў Беларусі прайшло ўчора ў, можна сказаць, суровай атмасферы. Выклікана гэта было некалькімі прычынамі: нявыкананымі прамысловасцю паказчыкамі, адставаннем па якасці прадукцыі, буйнымі дэбіторскімі запазычанасцямі і захаваннем вялікіх складскіх запасаў.**

### Безадказнасць — самая вялікая праблема

«Задачы і разгорнуты план дзеянняў на бягучы год зацверджаны Саветам Міністраў. Там кожнаму вызначана, што, як і калі рабіць. Прыярытэты нязменныя — рэнтабельнасць, экспарт, прамыя замежныя інвестыцыі, зніжэнне складскіх запасаў і знешняй дэбіторскай запазычанасці, — пачаў пасяджэнне **прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.** — Кіраўнікі галін і рэгіёнаў абавязаны, падкрэсліваю, стварыць умовы для перспектыўнага росту эканомікі. Вырашаючы бягучыя, безумоўна, важныя задачы, трэба думаць пра будучыню. Відавочна, што прадпрыемствы, якія дзейнічаюць, не могуць забяспечыць належную канкурэнтаздольнасць, і таму павінны быць смелыя інавацыйныя праекты. Рэалізаваць іх могуць маладыя і прафесіянальныя кіраўнікі. Трэба працаваць ініцыятыўна, хутка прымаць рашэнні і браць на сябе адказнасць. А з гэтым сёння самыя вялікія праблемы».

А ў той жа час аналіз 2013 года паказаў, што найгоршыя вынікі па прагнозных паказчыках у міністэрстваў прамысловасці, архітэктуры і будаўніцтва, канцэрнаў «Белнафтахім» і «Беллегпрам». Сярод выканкамаў — у Віцебскага, Брэсцкага і Гомельскага аблвыканкамаў. «З пералічаных па выніках трох гадоў горш за ўсіх спрацавалі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, «Беллегпрам» і «Беллеспаперапрам». Па першым і апошнім кадравыя рашэнні прыняты, цалкам абноўлена кіраўніцтва. Астатнім, у тым ліку і тым, хто праваліў заданні 2013 года, дадзена апошняя магчымасць даказаць сваю дзеяздольнасць, як і кіраўніцтву ўрада ў цэлым», — заявіў прэм'ер.

### За студзень паказчыкі трошкі лепшыя

«Прырост экспарту тавараў на 3 млрд долараў павінен быць забяспечаны пры зніжэнні знешняй дэбіторскай запазычанасці. Гэта патрабаванне кіраўніка дзяржавы — вярнуць грошы ў краіну, — нагадаў Міхаіл Мясніковіч. — Значыць, продажы на знешніх рынках прыйдзецца забяспечыць з мінімальнай адтэрміноўкай плацяжу, а таксама па схемах стымулявання экспарту. Сістэму справаздач па мэтавых паказчыках устанаўліваем штомесячную. Для ацэнкі работы кадраў няма неабходнасці чакаць заканчэння першага квартала 2014 года».

Як паказваюць вынікі студзеня, спрацавалі трошкі лепш, чым чакалася. Аднак не ўсе гэтага дасягаюць. «Горшыя за ўсіх паказчыкі ў Міністэрства прамысловасці... Не лепшыя і ў некаторых іншых, — паведаміў кіраўнік урада. — Да дысцыплінарнай адказнасці будуць прыцягваць кіраўніцтва ўжо па выніках студзеня». Нават аграпрамысловы комплекс не парадаваў: «Нягледзячы на сціплыя вынікі мінулага года АПК працягвае мінусаваць і ў студзені гэтага года. Асабліва па малацэ — Віцебская і Мінская вобласці».

**Першы намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір СЯМАШКА** заявіў, што па выніках 2013 года не забяспечаны ніводзін з ключавых параметраў: «Прамысловая вытворчасць дала толькі 95,2% пры прагнозе 107%. Экспарт тавараў і паслуг — 88,4% пры прагнозе 115,2%». Разумеючы ўсю складанасць 2013 года, урад пайшоў на некаторыя паслабленні ў плане адказнасці за невыкананне аб'ёмных паказчыкаў пры ўмове, што будуць выкананы якасныя параметры — рэнтабельнасць продажаў і зніжэнне запасаў прадукцыі. Але гэтага не адбылося. «Наш адзіны козыр на постсавецкім і сусветным рынку — параўнальна невялікая цана на прадукцыю», — лічыць першы віцэ-прэм'ер. Але для развіцця гэтага, хутчэй за ўсё, не хопіць. Якасць больш важная. Ёсць жа выслоўе: мы не такія багатыя, каб купляць танныя рэчы. Таму менавіта якасць і працягваюць патрабаваць ад нашых прадпрыемстваў.

### 3 банкамі будуць размаўляць тэт-а-тэт

Прынята рашэнне аб індывідуальнай рэструктурызацыі запазычанасці па крэдытах і пазыках перад банкамі для айчынных прадпрыемстваў. «Аб гэтым мы дамовіліся з кіраўніцтвам Нацбанка і камерцыйных банкаў. Не будзе нешта вырашацца агульна, будзем разглядаць кожнае прадпрыемства асобна», — паведаміў Міхаіл Мясніковіч. Дарэчы, па словах Уладзіміра Сямашкі, летась у рамках кампенсацыі працэнтаў расійскім банкам перайшло 617,2 млрд бюджэтных рублёў. Сёлета мяркуецца, што гэтая лічба вырасце да 917,5 млрд.

### Еўразійская інтэграцыя

У планах на 2014 год падрыхтоўка дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе. «У маі прэзідэнты будуць разглядаць праект гэтага дакумента, — нагадаў прэм'ер. — Наша пазіцыя: мы павінны стварыць паўнавартасны агульны рынак без выключэнняў і абмежаванняў са свабодай тавараў, паслуг, капіталу і працоўнай сілы. Па таварах сёння яшчэ ідзе работа над шматлікімі выключэннямі. Па паслугах і нашы некаторыя кіраўнікі міністэрстваў і прадпрыемстваў трымаюцца незразумела за што. Важнае пытанне з фінансавым рынкам. І гэта ўсё патрабуе вырашэння».

### Падтрымка прадпрымальніцтва

«Дырэктыва № 4 — гэта базавы дакумент, і ён павінен быць выкананы ў поўным аб'ёме, як і іншыя нарматыўна-прававыя акты, якія рэгулююць сферу бізнесу, — упэўнены Міхаіл Мясніковіч. — Сёння ў сферы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва працуе вялікая колькасць людзей, і ўрад створыць для іх неабходныя камфортныя ўмовы, як і для іншых суб'ектаў гаспадарання».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■ Фотафакт



Фота БЕЛТА.

Пытанні падрыхтоўкі праекта дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе, кадыфікацыі дагаворна-прававой базы МС і АЭП і далейшае развіццё інтэграцыйных працэсаў абмяркоўваліся на Пасяджэнні Савета Еўразійскай эканамічнай камісіі. У ім удзельнічалі Старшыня праўлення Банка развіцця Сяргей Румас і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Расіі Ігар Петрышэнка.

# «БЕЛКАЛІЙ» АПТЫМІЗУЕ СВАЕ ПАСТАЎКІ ВА ЎСЕ РЭГІЁНЫ СВЕТУ

**Беларуская калійная кампанія падвяла першыя вынікі дзейнасці на новым этапе свайго развіцця, які стартаваў летась у жніўні, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе БКК.**

Галоўнай задачай гэтага этапа стала незалежнае прасоўванне беларускіх калійных угнаенняў на знешніх рынках. Паляпшэнне дзейнасці замежных прадстаўніцтваў і даччыных кампаній, стварэнне гнуткай сістэмы паставак прадукцыі як балкернымі суднамі, так і кантэйнернымі лініямі, а таксама актывізацыя працы рэгіянальных складоў дазволілі Беларускай калійнай кампаніі летась у чацвёртым квартале максімальна аптымізаваць пастаўкі ва ўсе рэгіёны свету.

Новы фармат працы ў чацвёртым квартале дазволіў кампаніі цалкам выканаць распрацаваныя планы. Па выніках кастрычніка—снежня 2013 года БКК было экспартавана больш за 1,2 млн тон калійных угнаенняў, што больш чым на 10% перавысіла аб'ёмы экспарту адпаведнага перыяду 2012 года. Агулам летась было экспартавана каля 5,7 млн тон беларускага калію. Асобна прэс-служба кампаніі адзначае, што ў 2013 годзе БКК вытрымлівала першапачаткова занятую пазіцыю памяркоўнага зніжэння цэн і развівала гнуткую стратэгію продажу, прадыктаваную здаровым сэнсам і накіраваную на стварэнне блізкага партнёрства з кожным кліентам. Цяпер кампанія прагназуе далейшы паступальны рост аб'ёмаў у першым квартале сёлета.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Праблемы галіны

# ЖКГ: неабходна мяняць стэрэатыпы

**У гэтым годзе пракуратура будзе надаваць асаблівую ўвагу сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Юрый ДАРАГАКУПЕЦ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве, расказаў «Звяздзе» пра сутнасць сённяшніх праблем у сферы ЖКГ.**

Парламентарый падкрэсліў, што жыллёва-камунальная гаспадарка — гэта шматгаліновая структура, і ў кожным кірунку ёсць свае праблемы. «Сёння, напрыклад, наша парламенцкая камісія працуе практычна над новым законапраектам, які тычыцца пахаванняў і пахавальнай справы, — распавёў Дарагакупец. — Нават такі невялікі кірунак працы жыллёва-камунальных службаў мае свае праблемы, якія трэба адрэгуляваць на заканадаўчым узроўні».

Прадпрыемствы ЖКГ займаюцца забеспячэннем насельніцтва цяплом, вадой, электраэнергіяй, вывазам цвёрдых бытавых адходаў, аказаннем рытуальных паслуг...

«У цеплазабеспячэнні трэба прывесці ў парадак кацельні і цеплавыя сеткі, — адзначыў парламентарый. — Што да водазабеспячэння, то ў Беларусі вельмі шмат праблем з якасцю вады, якая змяшчае вялікую колькасць жалеза, — неабходна будаваць станцыі абезжалезвання».

**Недапушчальна, каб работнік ЖКГ асацыяваўся са словазлучэннем «п'яны сантэхнік». Гэты стэрэатып неабходна мяняць.**

Дэпутат звярнуў увагу на тое, што ЖКГ патрабуецца мадэрнізацыя, якая мае на ўвазе эфектыўны рамонт і эксплуатацыю жыллёвага фонду, вырашэнне праблем у сістэме цэнаўтварэння, упарадкаванне фарміравання сабекошту жыллёва-камунальных паслуг.

«Сёння камунальнікі для вытворчасці цяпла, падачы вады і іншых мэт спажываюць шмат энергарэсурсаў, — канстатаваў Юрый Дарагакупец. — Таму асаблівую ўвагу трэба надаць энергазберажэнню — для краіны гэта вельмі актуальна».

Таксама дэпутат выразіў заклапочанасць наконт таго, што ў сістэму ЖКГ часта ідуць не зусім падрыхтаваныя кадры. «Нараканняў з боку грамадзян шмат, і часта яны цалкам справядлівыя, — адзначыў Дарагакупец. — Сітуацыю трэба кантраляваць. Недапушчальна, каб работнік ЖКГ асацыяваўся са словазлучэннем «п'яны сантэхнік». Гэты стэрэатып неабходна мяняць».

У той жа час парламентарый лічыць, што якасць паслуг ЖКГ у многім залежыць і ад спажыўцоў гэтых паслуг: «Вось, напрыклад, стаяць сметніцы ў Мінску. А чалавек ідзе і, не падыходзячы, кідае фанцік ад цукеркі ці недакурак: пацэліў ці не — усё роўна ідзе далей… Бо ён ведае, што, калі ў сметніцу ён не трапіў, для таго, каб прыбраць, ёсць дворнік». Дэпутат упэўнены: чым больш людзі самі будуць сачыць за парадкам, тым акуратней будзе наўкола. «Асабліва гэта актуальна ў Год гасціннасці, — падкрэсліў Юрый Дарагакупец. — Беларусы заўсёды ўмелі прымаць гасцей, і сёння, напярэдадні чэмпіянату свету па хакеі, я спадзяюся, што мы пацвердзім гэтую сваю якасць».

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

**Наблюдательный совет ОАО «Универсам Рига»**
**сообщает о проведении очередного Общего собрания акционеров, которое состоится 27 марта 2014 года в 13.00 со следующей повесткой дня:**

1. О результатах работы Общества за 2013 год и основных направлениях деятельности Общества в 2014 году.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2013 году.
3. Утверждение заключения ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2013 год. Рассмотрение результатов аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2013 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счета «Прибыли и убытки» Общества за 2013 год.
5. О распределении чистой прибыли за 2013 год и выплате дивидендов.
6. О направлениях использования чистой прибыли в 2014 году.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. О заключении сделки, в совершении которой имеется заинтересованность аффилированного лица Общества.

Собрание состоится по адресу: **г. Минск, ул. Сурганова, 50, торговый центр «Рига».**

Регистрация участников собрания будет проводиться в день собрания **с 12.30 до 13.00.**

Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность; представителю акционера — доверенность и документ, удостоверяющий личность.

*Наблюдательный совет ОАО «Универсам Рига»*

УНП 100299678

**ОАО «Трест Белстромремонт»** УНП 100135597
**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, которое состоится 3 марта 2014 года в 12.00**
в административном здании по адресу: г. Минск, пер. С. Ковалевской, 61

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Отчет о результатах работы Общества за 2013 год и об основных показателях прогноза социально-экономического развития Общества на 2014 год.
2. Утверждение годового баланса, отчета о прибылях и убытках за 2013 год.
3. Утверждение порядка распределения чистой прибыли, остающейся в распоряжении предприятия за 2013 год, размера и даты выплаты дивидендов за 2013 год.
4. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2014 год.
5. Избрание членов Наблюдательного Совета и ревизионной комиссии.
6. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного Совета и ревизионной комиссии.

Регистрация акционеров (их представителей) начинается **в 10.00.**

**При себе необходимо иметь паспорт (для представителя акционера – доверенность).**

УНП 500032914

**ОАО «Белхимэнерго»**
**УВЕДОМЛЯЕТ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО ГОДОВОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА**
**24 марта 2014 года в 11.00**
по месту нахождения общества по адресу: **г. Минск, пер. Асаналиева, 3.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Избрание председателя Общего собрания акционеров.
2. Утверждение отчета Ревизионной комиссии.
3. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках.
4. Распределение прибыли и убытков.
5. Объявление размеров дивидендов и определение срока их выплаты.
6. Избрание Наблюдательного совета.
7. Избрание Ревизионной комиссии.

Регистрация участников осуществляется **с 10.00 до 11.00.**

При регистрации участники обязаны предъявить документ, удостоверяющий личность, представители участников – документ, удостоверяющий личность и доверенность.

**С материалами к собранию можно ознакомиться после 01 марта 2014 года по адресу: г. Минск, пер. Асаналиева, 3.**

УНН 100363932

■ Экалогія жылля

# НЕ МЕРЗНУЦЬ УЗІМКУ, НЕ «ПАРЫЦЦА» ЎЛЕТКУ

## Ці патрэбна «тэрмафутра» вашаму дому?

**Зімой кватэра ператвараецца ў лядоўню, а ў пякельны летні санцапёк — у «духоўку». Знаёмыя адчуванні? Уся справа ў дрэнным мікраклімаце вашага жытла. Прыйсці да балансу тэмператур, аднак, можна: для гэтага эколагі прапануюць уцяпліць дом звонку. Тады ў вашым доме зіма будзе цёплай, а лета — прахалодным.**

### КАМУ ГЭТА ТРЭБА?

«Чым таўсцейшыя сцены, тым лепш яны захоўваюць цяпло» — з гэтым аргументам не паспрачаешся. Цікава і тое, што менавіта праз сцены наша жытло губляе больш за 40 працэнтаў цяпла. На другім месцы па яго стратах — вокны. Уцяпляць дом можна як звонку, так і знутры. Спецыялісты папярэджваюць: калі рабіць знутры, то ёсць рызыка, што вільгаць будзе заставацца на ўцяпляльніку і прывядзе да цвілі. У сваю чаргу яна можа стаць крыніцай захворванняў жыхароў. Але якасны рамонт знутры ратуе сітуацыю ў выпадках, калі дом з'яўляецца архітэктурнай каштоўнасцю і змяненне вонкавага выгляду будынка забаронена. «Тэрмафутра» павінна стаць клопатам не аднаго жыхара дома, а ўсіх — толькі ў гэтым выпадку затраты будуць апраўданымі, — упэўнены Антон Гаховіч, кансультант па энергазберажэнні Цэнтра экалагічных рашэнняў (ЦЭР). — Бо, па законах фізікі, цяпло з «цёплай» кватэры будзе «ўцякаць» у халодную суседскую праз столь і падлогу». Ці варта тады выкідаць грошы на вецер? Пэўна, лепш спачатку заахвоціць суседзяў зрабіць дом цяплейшым.

### ЦІ «СХУДНЕЮЦЬ» ЖЫРОЎКІ?

Адно з галоўных пытанняў, якім задаюцца жыхары, — ці прынясуць «тэрмафутры» хоць якую выгаду кашальку? Ці стануць жыроўкі менш «тлустымі»? Сапраўды, па разліках Антона Гаховіча, уцяпленне аднапакаёвай кватэры, плошча сцен якой складае 10,1 кв. м. каштуе прыкладна 2,5 мільёна рублёў. Спецыяліст адзначыў, што ў такім выпадку ўцяпленне акупіцца за 20 гадоў, а ў год можна сэканоміць усяго 100 тысяч. Не надта многа!

Па падліках Уладзіміра Кляпацкага, дырэктара прыватнага прадпрыемства «Вертыкальныя тэхналогіі», рэальная сума рамонту складае 4 мільёны рублёў. Дадаткова аплачваюцца, напрыклад, паслугі альпіністаў — у тым выпадку, калі гаворка ідзе пра вышэйшыя паверхі. Як бачым, тэорыя адрозніваецца ад практыкі і ў такім разе сэканоміць не атрымаецца.

### ЦІ ІСНУЕ ІДЭАЛЬНЫ МАТЭРЫЯЛ?

Анатоль Калач, супрацоўнік праграмы па хімічнай бяспецы і адходах ЦЭР, кажа, што сярод уцяпляльнікаў найбольш вядомыя чатыры: каменная вата, шклавата, пенапласт і пенаплекс. У кожнага з іх ёсць свае мінусы і плюсы. Што патрэбна ведаць пры выбары ўцяпляльніка? З якой сыравіны ён зроблены? Ці шкодны ён пры выкарыстанні і мантажы? Наколькі бяспечны пры пераапрацоўцы? Каменная вата, хоць і робіцца з натуральнай сыравіны і даўгавечная, захоўвае ў сабе фармальдэгід — небяспечнае рэчыва, якое можа прывесці да раку. Шклавата шкодзіць рабочым пры мантажы, бо складаецца з шкловалокнаў, якія трапляюць у лёгкія і выклікаюць сур'ёзныя захворванні дыхальнай сістэмы. Пенапласт жа разбураецца пад уздзеяннем тэхнічных вадкасцяў і пароў і баіцца тэмпературы ў 300 градусаў. Пенаплекс, як і пенапласт, неэкалагічны ў вытворчасці. Такім чынам, ідэальнага варыянта не існуе. Але часцей за ўсё людзі замаўляюць менавіта пенапласт, бо ён самы танны з прыведзеных уцяпляльнікаў.

### СХЕМА ПРАВІЛЬНАГА ЎЦЯПЛЕННЯ

Уладзімір Кляпацкі — чалавек, для якога ўцяпленне дамоў стала бізнесам. Ён распавёў, у якой паслядоўнасці павінны ісці работы. «Спачатку на сцяну кладзецца клей, а на яго — уцяпляльнік. На ліст ідзе пяцёрка дзюбеляў, на якія ставіцца шкласетка, — распавядае Уладзімір. — Бывае, што тынкуюць адразу па пенапласце. Але такая аддзелка ў хуткім часе злезе. Шкласетка — гэта быццам шкілет для тынкоўкі. Затым ізноў кладзецца клей, на яго — грунт пад тынкоўку, і апошнім этапам становіцца накладванне тынкоўкі. Гатова!»

Асноўныя памылкі ва ўцяпленні звязаны з некваліфікаванасцю рабочых. Часта здараецца так, што не выконваюцца правілы захоўвання ўцяпляльніка: пенапласт трымаюць на сонцы, і ён разбураецца. Таксама варта ўлічваць акуратнасць работы і надвор'е — «крывыя рукі» і шкодныя тэмпературы могуць усё сапсаваць!

### ХАЦЕЛІ, ЯК ЛЕПШ, А АТРЫМАЛІ?

Жыхары «панэлек» прывыклі выбіраць самыя танныя матэрыялы і рабочую сілу. З-за абыякавасці людзі атрымліваюць недаўгавечнае ўцяпленне, якое і цяпла ў дом не прынясе, і пашкодзіць сцены будынка. Пра кантроль за працэсам таксама забываюць, а дарма: самастойна можна замовіць тэрмаграфічную працэдуру — праверыць цеплавізарам, наколькі якасна праведзена ўцяпленне. Прылада паказвае, як размяркоўваецца тэмпература па паверхні, што даследуецца. «Існуюць яшчэ дзве «кантрольныя працэдуры, — дадае Наталля Андрэенка, каардынатар праектаў па энергіі і клімаце МА «Экапартнёрства». — «Тэст на скразняк» выяўляе, праз якія месцы ў доме «ўцякае» цяпло. Трэці варыянт праверкі — энергетычная сертыфікацыя будынка. У дакуменце прапісваецца, наколькі памяншаюцца энергетычныя выдаткі ў выпадку ўцяплення. Гэта своеасаблівая таблічка для параўнання: што было «да» і што было «пасля».

Для большай эфектыўнасці эксперт раіць праводзіць і «тэст на скразняк», і тэрмаграфічны кантроль цеплавізарам. Каб уцяпленне не адбылося па схеме «Хацелі, як лепш, — атрымалі, як заўжды», замовіць спецыялістаў і цеплавізар можна бясплатна, звярнуўшыся ў Цэнтр экалагічных рашэнняў.



### СЛОВА — ЖЭСУ!

Калі вы ўсё ж наважыліся ўцяпліць дом, трэба абавязкова звярнуцца ў ЖЭС. Ёсць верагоднасць, што менавіта ваш дом у хуткім часе будзе ўцяпляцца па праграме капітальнага рамонту жыллёвага фонду на 2005–2015 гг. Аднак, датычыцца ён старых «хрушчовак», а не «маладых» панэльных дамоў. Да таго ж уцяпленне — працэдура, якая патрабуе ўзгаднення з боку ЖЭСа. Праўда, гэта не паўсюдная практыка, але лепш ЖЭС не ігнараваць — тым больш калі ёсць магчымасць выкарыстаць сродкі капітальнага рамонту, а не толькі ўласныя грошы. Ёсць выбар — звяртацца па паслугу ўцяплення ў ЖЭС альбо ў прыватную фірму. Для параўнання: кошт уцяплення на 1 кв. м. у прыватнай канторы складае да 700 тыс. рублёў, у ЖЭСе — 460 тыс. рублёў.

**Кацярына РАДЗЮК**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Жарский сельский исполнительный комитет Ушачского района Витебской области**
**проводит открытый аукцион по продаже земельного участка для строительства и обслуживания жилого дома гражданам Республики Беларусь, расположенного на территории сельсовета**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Наличие инженерных сетей | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Городец, 224982402601000049 | 0,1691 | Сети электроснабжения | 6455222 Кроме расходов на организацию и проведение аукциона | 15 000 000 | 1 500 000 |

Задаток перечисляется на р/с 3641328040935 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Полоцк код 150801648, УНП 300007203, ОКПО 28677767, код платежа 04901 Жарский сельисполком.

Порядок проведения аукциона оговорен в положении о его проведении. Аукцион состоится **19.03.2014 г., начало 12.00,** по адресу: д. Жары, ул. Центральная, 18 (здание исполкома) Ушачского района Витебской области.

**Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 18.03.2014 года до 17.00 по вышеуказанному адресу.**

**Телефоны: (80158) 2 36 42, 2 36 43.**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

19 лютага 2014 г.
№ 3 (323)


**ВЫБАРЫ: КРОК ЗА КРОКАМ**

## ХТО ХОЧА СТАЦЬ ДЭПУТАТАМ?

Надзея ЮШКЕВІЧ

**20 лютага скончыцца рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў. Да гэтага дня тэрытарыяльныя камісіі правяраюць звесткі пра ўсіх вылучэнцаў у кандыдаты (нагадаем, апошні дзень вылучэння быў 10 лютага). Мікалай ЛАЗАВІК, сакратар Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэферэндумаў, расказаў нашаму карэспандэнту, хто хоча 23 сакавіка пазмагацца за народны давер.**

### Аўтарытэт аўтарытэту — розніца

*Усяго было вылучана 22 784 чалавекі на 18 816 выбарчых акруг.*

— Калі казаць пра вылучэнцаў ад працоўных калектываў, то гэта людзі, якія ўжо «адбыліся» як спецыялісты, маюць пэўны вопыт кіраўніцтва, якія чагосьці дасягнулі ў сваім жыцці як прафесіяналы, — адзначыў Мікалай Лазавік. — Сярэднестатыстычны вылучэнец неабавязкова займае высокую пасаду, але, як правіла, гэты чалавек працай ужо даказаў сваю патрэбнасць не толькі пэўнаму населенаму пункту, але і краіне ў цэлым.

Мікалай Лазавік падкрэсліў, што шляхам збору подпісаў могуць вылучацца і тыя асобы, якія карыстаюцца заслужаным аўтарытэтам сярод выбаршчыкаў, і тыя, якіх амаль ніхто не ведае.

Што да вылучэнцаў ад палітычных партый (дарэчы, ад агульнай колькасці ахвотных стаць дэпутатамі партыйцы складаюць каля 3%), то гэта палітычныя актывісты.

— Як дзеячы сваёй палітычнай арганізацыі, яны звычайна вельмі актыўныя, — заўважыў Мікалай Лазавік. — Але не заўсёды гэтыя людзі імкнуцца і могуць вырашыць сацыяльна значныя пытанні, праблемы мясцовага значэння.

Сакратар Цэнтральнай камісіі звярнуў увагу на тое, што вылучэнцы ад партый часта больш клапоцяцца аб агульнадзяржаўных пераўтварэннях, аб змяненні сістэмы дзяржаўнага кіравання.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



**ПРАБЛЕМЫ І РАШЭННІ**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ВЯСКОЎЦАМ ДАПАМОЖА КУП. А ХТО ДАПАМОЖА КУПУ?

**Не першы год вядуцца спрэчкі і дыскусіі вакол камунальных унітарных прадпрыемстваў пры сельвыканкамах. Стаўленне да гэтых фарміраванняў рознае. Адны кіраўнікі выказваюць ім падтрымку: маўляў, дзякуючы КУПам у сельскай мясцовасці выконваюцца самыя розныя работы для вяскоўцаў, у тым ліку і на прысядзібных участках. Іншыя сумняваюцца ў іх эфектыўнасці: выдаткі на ўтрыманне значныя, а прыбыткі малыя.**

У Цімкавіцкім сельсавеце Капыльскага раёна КУП дзейнічае больш за 10 гадоў. З'явіўся ён дзякуючы неймаверным намаганням старшыні сельскага Савета дэпутатаў Алены Острыкавай.

— Згадваю, як нялёгка было наладзіць яго работу: даводзілася ахвяраваць выхаднымі, вольным часам, даставаць паліва, запчасткі. Не памяншала клопатаў і цяпер, калі сістэма наладжана. Таму я разумею сваіх калег, якія не хочуць ствараць такія структуры. Гэта дадатковая нагрузка да непасрэдных спраў і абавязкаў. Праблема і ў тым, што работа КУПаў сезонная. Вясной, летам адбою ад кліентаў няма: ворыва, апрацоўка асабістых прысядзібных участкаў, пасадка бульбы. Зімой таксама не хочацца прастойваць: зарплату ж трэба плаціць работнікам, хоць і невялікую, — канстатуе Алена Острыкава. — Разам з тым, лічу, КУПы вельмі патрэбны для нашага населенага пункта. Мясцовая гаспадарка аказвае паслугі ў асноўным сваім работнікам і пенсіянерам, якія тут працавалі. Астатнія катэгорыі насельніцтва аказваюцца нібы ўбаку і вымушаны звяртацца да прыватніка. Але гэта не самае лепшае выйсце са становішча.

Што цалкам зразумела: прыватніку трэба аддаць грошы за работу адразу. А калі няма чым разлічыцца? Даводзіцца добра папрасіць, каб пайшоў насустрач — адкладу разлік...

— А ў нас даступная і простая сістэма. Запісацца на чаргу можна па тэлефоне. Калі ў чалавека няма чым сёння разлічыцца за паслугу, даём яму адтэрміноўку да зарплаты, пенсіі ці магчымасць аплаты па частках. Разумееш, што ў вёсцы жывуць не самыя багатыя людзі, — лічыць старшыня сельвыканкама.

Акрамя таго, дзякуючы даступным для грамадзян расцэнкам прадпрыемства «падрэзала» кошт паслуг у прыватніка. «Глядзім, каб не быць у страце, але пры гэтым тры скуры з землякоў не дзяром», — акрэсліла сваю пазіцыю Алена Острыкава.

Старшыня шчыра прызнаецца, што ў сувязі з далучэннем да Цімкавіцкага сельсавета новых тэрыторый была спакуса закрыць КУП. Бо, вядома ж, спраў і клопатаў прыбавілася, а ў штаце КУПа працуе толькі адзін трактарыст: «Самой даводзіцца быць і бухгалтарам, і менеджарам, і пастаўшчыком запчастак». Але захваляваліся вяскоўцы, пачалі тэлефанаваць, угаворваць захаваць структуру. Пакуль Острыкава адклала рашэнне.

— У зімовы час адпампоўваем каналізацыю ў насельніцтва, чысцім дарогі ад снегу. Разам з тым, шукаем заробкі ў пабочных арганізацыях. У мінулым годзе працавалі на будаўніцтве жывёлагадоўчых фермаў: адвозілі пясок. Сёлета прасавалі салому ў мясцовай гаспадарцы. Але не заўсёды з намі разлічваюцца своечасова. Бывае, што наогул не пералічваюць грошы. Хадзіць па судах — сабе даражэй, — зазначыла мая суразмоўца.

На тэрыторыі сельсавета сіламі камунальнага прадпрыемства таксама вывозяць смецце ад насельніцтва. «Бяром усё, што выкідваюць. Разумеем: пенсіянерам складана пазбавіцца ад пажухлых кветак, абрэзаных галін дрэў ды кустоў. Для нас вываз смецця — стратны. Ёсць грамадзяне, якія не хочуць заключаць дагаворы, хоць кошт цалкам пад'ёмны — усяго тры тысячы рублёў у месяц. На мой погляд, камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы патрэбны, але, магчыма, не пры сельвыканкамах. Можа, лепш арганізаваць такія падраздзяленні пры мясцовых сельгасарганізацыях або на базе жыллёва-камунальных гаспадарак, якія датуюцца дзяржавай».

Дадам, што КУПы пры сельвыканкамах працуюць па спрошчаным падаткаабкладанні. У Цімкавічах за мінулы год зарабілі 120 мільёнаў рублёў, у тым ліку на 87 мільёнаў аказана паслуг толькі насельніцтву. «Мы заплацілі 6 млн падатку. Сума невялікая, але, тым не менш, для нас гэта грошы. Нядрэнна, каб нам далі нейкую палёгку па падатках, паколькі мы не можам значна павялічыць кошт за выкананыя работы. Гэта ж вёска! Ёсць бабулькі, якія наогул не ў стане нам заплаціць, і КУП вымушаны аказваць ім паслугі бясплатна — гэта ж нашы людзі».

Бясспрэчна, мець ці не мець такія прадпрыемствы — справа кожнага старшыні сельвыканкама. Адзін з магчымых варыянтаў падтрымкі КУПаў прапанавала старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Святлана Герасімовіч. У прыватнасці, каб падатак на прыбытак, які цяпер камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы (КУПы) плацяць у бюджэт раёна, заставаўся ў бюджэце сельскага Савета, ён і быў бы патрачаны на першачарговыя патрэбы ў межах сваіх паўнамоцтваў.

— Алена Остыкава пагаджаецца, што прапанова слушная. Сродкі невялікія, але іх можна было б накіраваць на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы КУПаў, выплату зарплаты і пашырэнне штату ці, напрыклад, купіць неабходны інвентар, бензапілу, якія спатрэбіліся б пры добраўпарадкаванні тэрыторый.

— А наогул цяжка развівацца з КУПам. Гэта маё тварэнне, якое выпакутавала і выпесціла, — прызналася на развітанне Алена Мечыславаўна. — І перш за ўсё ў нашай дапамозе маюць патрэбу людзі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

**Аляксандр УДОДАЎ:**

## «ЧАЛАВЕКУ ВАЖНА АДЧУВАЦЬ, ШТО ЎЛАДА ПОБАЧ»



**Да дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь людзі прыходзяць з самымі рознымі пытаннямі. Адны — каб дапамог печку ці дах адрамантаваць, іншыя — каб дабіўся вырашэння агульных праблем пэўнай тэрыторыі. Аляксандр Удодаў, які год таму быў выбраны ў парламент ад Калінкавіцкай выбарчай акругі № 41, выслухоўвае ўважліва кожнага — незалежна ад статусу, узросту і маштабу праблемы. Гэта ж яго выбаршчыкі, якія жывуць у аддаленых ад сталіцы Калінкавіцкім і Акцябрскім раёнах. Аляксандр Пятровіч на працягу дваццаці гадоў узначальваў Гомельскае аддзяленне беларускай чыгункі. Гаворыць, што некаторыя пытанні вырашыць лягчэй, калі звяртаешся напрамую да губернатара Гомельскай вобласці.**

— Разам са старшынёй аблвыканкама Уладзімірам Дворнікам мы думалі, як дапамагчы жыхарам вуліцы Савецкай у Калінкавічах. А справа ў тым, што частка яе домаўладанняў не была падключана да цэнтральнага водаправода. Праектна-каштарысную дакументацыю калісьці зрабілі, а вось на ўвасабленне яе ў жыццё грошай не хапіла. Да мяне прыходзілі выбаршчыкі на працягу многіх гадоў, заклапочаныя бытавымі нязручнасцямі. У сваім звароце да губернатара я папрасіў выдзеліць даволі вялікую суму грошай на вырашэнне праблемы. Сёння можна казаць пра вынік: домаўладанні падключаны да сістэмы цэнтралізаванага водазабеспячэння. Калі ў заапарку гарадскога пасёлка Акцябрскі сапсавалася дзіцячая чыгунка, я звярнуўся па дапамогу да свайго былога калегі, а сёння — начальніка Магілёўскага аддзялення Беларускай чыгункі Аляксандра Маісеева. І да Дня абароны дзяцей работу дзіцячай чыгункі на тэрыторыі заапарка аднавілі. Маленькія жыхары гарадскога пасёлка былі ў захапленні. У гэтым жа райцэнтры мы адрамантавалі аўтобус для тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва — пасля таго, як да мяне звярнулася яго кіраўнік Таццяна Кацярыніч. Але, часцей за ўсё людзі звяртаюцца з хранічнымі праблемамі, якія датычацца ЖКГ. Як правіла, яны дробныя, але ж і іх трэба абавязкова вырашаць. У Акцябрскім атрымалася значна палепшыць жыллёвыя ўмовы для грамадзянкі. З дома пад знос яна пераехала ў добраўпарадкаваную кватэру.

**— Аляксандр Пятровіч, для ўсёй краіны, і для Гомельшчыны ў прыватнасці, уласцівая праблема са станам дарог, асабліва ў невялікіх населеных пунктах...**

— Пытанняў па дарогах сапраўды шмат. У многіх населеных пунктах зроблена быццам усё для камфортнага жыцця, але ж далёка не паўсюль хапіла грошай на дарогі. Я пастаянна звязваюся са старшынямі Акцябрскага і Калінкавіцкага райвыканкамаў, удакладняю планы іх работы ў тым ліку па гэтай праблеме. У некаторых выпадках атрымліваецца штосьці карыснае зрабіць для вясковага насельніцтва. Акрамя таго, дэпутацкі корпус прыняў законапраект «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання і прадпрымальніцкай дзейнасці» — ён прадугледжвае ўвядзенне з 1 студзеня гэтага года дзяржаўнай пошліны за допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху. Яна будзе размяркоўвацца 50 на 50 паміж рэспубліканскім і мясцовымі бюджэтамі і накіроўвацца на фінансаванне работ па будаўніцтве і рэканструкцыі дарог. Прадугледжана, што сродкі мясцовых бюджэтаў будуць накіроўвацца на будаўніцтва і рэканструкцыі не толькі мясцовых аўтамабільных дарог, але і вуліц, якія з'яўляюцца працягам такіх дарог. Па прыблізных падліках збор гэтых сродкаў толькі на Гомельшчыне можа скласці больш за Br132 млрд пры зборы ў памеры дзвюх базавых велічынь толькі з фізічных асоб.

**— А вы ўпэўнены, што людзі будуць своечасова выплачваць гэтыя пошліны і не пачнуць ігнараваць своечасовае праходжанне тэхагляду?**

— Безумоўна, такая небяспека была. Але ж я лічу: навошта нам аўтамабілі, калі мы пагаджаемся з існаваннем дрэнных дарог? Мне здаецца, што беларусы — вельмі дысцыплінаваныя і законапаслухмяныя грамадзяне. Памятаеце, як дагэтуль мы доўга «прабівалі» закон, згодна з якім можна было б канфіскаваць машыну за кіраванне ёю ў п'яным выглядзе? Сёння ён ужо працуе. Так і гэты закон мы пачалі «абкатваць». Скажыце, як кіроўца можа выязджаць на дарогу без своечасовага праходжання тэхагляду? Гэта ж патэнцыяльны забойца, які падвяргае небяспецы не толькі сябе, але і іншых людзей. Між тым, трэба падумаць над стварэннем бяспечных умоў і ў іншых сітуацыях. У некаторых населеных пунктах (напрыклад, Васілевічах ці Бабічах) знаходзіцца па два чыгуначныя пераезды на вёску. Ад Васілевічаў да Хойнікаў увогуле больш за 20 пераездаў. Іх колькасць трэба зменшыць, і мы ініцыіруем, каб іх стала менш. Тым больш яны вельмі небяспечныя. Мне здаецца, што адказнасць за бяспеку на чыгунцы павінны падзяліць з чыгуначнікамі і супрацоўнікі МУС. У тым ліку зрабіць больш жорсткім пакаранне для парушальнікаў на пераездзе — аж да пазбаўлення правоў. А хуліганства, якое можа прывесці да стварэння аварыі, трэба прыраўноўваць да замаху на тэракт. Напрыклад, калі зламыснікі б'юць лінзы на святлафорах, выкрадаюць акумулятарныя батарэі са святлафораў на чыгуначных пераездах, вырываюць сігнальныя кабелі і г.д.

**— У Палаце прадстаўнікоў вы працуеце больш за год. Што карыснага даў гэты вопыт?**

— Ёсць такое выказванне: «Не народ для ўрада, а ўрад для народа». Так і павінна быць. Мне цікава працаваць з людзьмі, якія прыходзяць да мяне па параду, дапамогу. Дарэчы, выбаршчыкі могуць і паскардзіцца на дэпутата, калі ён не рэагуе на іх запыт. Чалавеку важна адчуваць, што ён не застанецца сам-насам са сваімі праблемамі, што ўлада, у тым ліку заканадаўчая, зробіць усё магчымае для паляпшэння яго жыцця.

**— У гэтым сэнсе наколькі важнай вы лічыце работу мясцовых Саветаў дэпутатаў?**

— Калі з'явілася ініцыятыва ўзмацніць мясцовую выканаўчую ўладу і пры гэтым ліквідаваць на пярвічным узроўні ўладу выбарчую, я быў супраць. Бо ў сельскіх Саветаў вельмі высокі ўзровень адказнасці, хоць, безумоўна, як і паўсюль, усё залежыць ад канкрэтнага чалавека.

Як дэпутат, я працую ў Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі. Але ж да мяне накіроўваюць законапраекты і з іншых камісій. У прыватнасці, курырую камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД і па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанні. Здараецца, што ў законапраект паступае да 100 заўваг і прапаноў. Кожную рабочай камісіі трэба разгледзець і вырашыць: адхіліць ці пагадзіцца.

**— Якім вы бачыце прэтэндэнта на дэпутацкае месца ў мясцовых Саветах дэпутатаў?**

— Звычайна выбіраюць тых, хто ўжо мае вопыт стасункаў з людзьмі. Як кажуць: спачатку трэба думаць пра радзіму, а потым пра сябе. Цалкам згодны з гэтым. Заўсёды па жыцці, на любой пасадзе кіраваўся менавіта гэтым прынцыпам! Вось мая выбарчая акруга — гэта больш за 70 тысяч чалавек. І пра іх я клапачуся. Так і для дэпутатаў мясцовых Саветаў. Галоўнае — любіць людзей і клапаціцца пра іх.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**ПРА ГРОШЫ — КАМПЕТЭНТНА**

## КАБ ФІНАНСЫ НЕ СПЯВАЛІ РАМАНСАЎ...

Надзея ДРЫЛА

**Для старшыняў сельскіх Саветаў ёсць прыемная навіна! З 4 лютага пашырыліся магчымасці выкарыстання сродкаў, атрыманых ад продажу зямлі на аўкцыёне. Пра гэта і не толькі размаўляем з начальнікам упраўлення мясцовых бюджэтаў галоўнага ўпраўлення бюджэтнай палітыкі Міністэрства фінансаў Таццянай АСТРЭЙКА.**

**— Таццяна Анатольеўна, ведаю, што старшыні сельскіх Саветаў вельмі чакалі прыняцця Указа №59. Якія патрабаванні ён прад'яўляе да гаспадароў на месцах?**

— Яшчэ зусім нядаўна старшыні сельскіх Саветаў былі абмежаваны ў магчымасцях аператыўна выкарыстоўваць сродкі, атрыманыя ад правядзення аўкцыёнаў, а таксама за заключэнне дагавораў арэнды зямельных участкаў і за зямельныя ўчасткі, якія прадстаўляліся ва ўласную маёмасць без правядзення аўкцыёнаў. Па сутнасці, асноўны аб'ём гэтых сродкаў яны маглі або накіраваць у бюджэты вышэйшага ўзроўню (для выкарыстання на мэты, устаноўленыя Указам №667), або назапашваць на рахунках сваіх бюджэтаў. Старшыні сельскіх Саветаў былі не зусім задаволены гэтым. І іх можна зразумець. Калі ты стараешся, праводзіш аўкцыён, а пасля не можаш аператыўна выкарыстаць заробленыя грошы на вырашэнне задач па развіцці сваіх тэрыторый, то, пагадзіцеся, мэтазгоднасць ініцыятывы зніжаецца. Як той казаў, бачыць вока, ды вісіць высока... Таму, каб кіраўнікі сельсаветаў у большай ступені адчулі сябе гаспадарамі на месцах, Указам № 59 былі ўнесены змяненні і дапаўненні ва Указ № 667 «Аб адабранні і прадастаўленні зямельных участкаў». Цяпер сродкі, якія атрымліваюць пярвічныя бюджэты ад аўкцыёнаў, плата за зямельныя ўчасткі могуць накіроўвацца ў тым ліку і на добраўпарадкаванне тэрыторый. Пры гэтым прыярытэтным кірункам усё ж такі з'яўляецца стварэнне аб'ектаў інфраструктуры. Не варта агулам страчваць гэтыя грошы на бягучае добраўпарадкаванне. Трэба імкнуцца ўкладаць дадатковыя сродкі ў стварэнне капітальных аб'ектаў, якія б доўгі час прыносілі карысць мясцоваму насельніцтву.



*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

**МЯСЦОВЫ ЧАС**

## СВОЙ СЯРОД СВАІХ

Нэлі ЗІГУЛЯ

**Дэпутат Вепрынскага сельскага Савета Віктар Паверany — чалавек у Чэрыкаўскім раёне вядомы, а для жыхароў аграгарадка Майскі наогул родны. Тут ён адначасова і старшыня сельскага камітэта, і кіраўнік участка Чэрыкаўскага жылкамгаса. Кожны жыхар на памяць ведае яго тэлефон. Таму што з якім пытаннем ні звярніся — дапаможа. У Майскім, кажуць, толькі на Павераным усё і трымаецца.**

### І жнец, і швец...

Да 1989 года ў пасёлку Майскі было ўсяго 14 двароў. Але пасля чарнобыльскай аварыі ён стаў другім домам для перасяленцаў з забруджаных вёсак Вепрынскага сельсавета. Сёння яго насельніцтва складае 464 чалавекі. І кожнага Віктар Паверany ведае па імені. Большасць — пенсіянеры, якім вельмі патрэбна дапамога. І куды тады ісці, калі не да свайго дэпутата? Ведаюць: ён не толькі чулы чалавек, але і майстар на ўсе рукі. Трактарыст, камбайнер, кіроўца, сантэхнік, цясляр — пальцаў на руцэ не хопіць, каб пералічыць усе таленты Віктара Рыгоравіча. «Спецыяльнасці я не маю, школу скончыў і ўсё, — сціпла кажа ён. — За працай усяму навучыўся. Дзед, які з дрэва ўмеў рабіць усё, паказаў, як цяслярыць. Я потым сам калодзеж зрубіў, альтанку паставіў. Мог бы і хату пабудаваць, калі была б патрэба».

Мясцовыя пенсіянеркі яму розную бытавую тэхніку нясуць, каб адрамантаваў. Ён нікому не адмаўляе. Сваёй суседцы з першага паверха шпалеры паклеіў, падлогу пафарбаваў. А хто пра яе яшчэ паклапоціцца? Жанчыне за 80, родных няма, ды яшчэ праблемы са здароўем.

— Мне і ноччу тэлефануюць, калі што здарыцца, — кажа Віктар Рыгоравіч. — У старэнькай бабулі аднойчы «прарвала» трубу, яна мне нешта гаворыць у тэлефонную трубку, а я нічога зразумець не магу. Пытаюся прозвішча і бягу. Па дарозе забіраю памочніка з кацельні, і разам з ім вырашаем праблему. З Чэрыкава пакуль даедуць, тут усё затопіць.

Некалькі гадоў таму ў Майскім здарылася трагедыя: шматдзетны бацька скончыў жыццё самагубствам. Жонка засталася адна з пяццю дзецьмі, самаму маленькаму — год і два месяцы. Ды яшчэ цяжарная. Даходы і так былі невялікія, а тут зусім без сродкаў аказаліся. На «дзіцячыя» грошы не разгонішся...

Гэтай сям'і Паверany калісьці дапамог пераехаць у аграгарадок з выміраючай вёскі, а калі гаспадара не стала, шэфства арганізаваў. І дроў дапамог назапасіць, і рамонт зрабіць. Нават дабіўся, каб жанчыне пенсію па страце кармільца выплачвалі.



**Старшыня Майскага сельскага Савета Ганна ЦІХАНАВА, старшыня Майскага селькама Віктар ПАВЕРАНЫ, старшыня Чэрыкаўскага раённага Савета дэпутатаў Наталля ГАТОЎЧЫК.**

### Да Чэрыкава скаргі не даходзяць

Кіраўніцтва раённага жылкамгаса жартуе: «Паверany, мабыць, ты ўсіх там запалохаў, бо яны ні на што не скардзяцца.» Толькі адкуль скаргам узяцца, калі начальнік участка іх яшчэ на пачатковым этапе вырашае. А баяцца яго хіба што лайдакі ды п'яніцы. На яго ўчастку дысцыпліна жорсткая. Сам працуе і іншым спуску не дае. На ім трымаюцца і жылы фонд, і кацельня, і водазаборы, а зараз збіраюцца яшчэ і мясцовы калгас да камунальнай гаспадаркі далучыць. Віктар Рыгоравіч — чалавек безадмоўны, але калгас, лічыць ён, — гэта ўжо занадта. Яму і з электрычнай кацельняй хапае: вельмі капрызная ў абслугоўванні. Калі гэтай зімой ударылі маразы, Паверany там і дняваў, і начаваў.

— Трэба да справы адносіцца адказна, тады і скаргаў не будзе, — упэўнены ён. — А калі з'явіліся пытанні, вырашаць неадкладна. Калі гэтага не зробіш адразу, то потым назапасіцца столькі, што рукі апусцяцца.

Старшыня селькама яшчэ і прафілактыкай займаецца. Ходзіць па праблемных дамах разам з назіральнай камісіяй. А нядаўна разам з участковым інспектарам самагоншчыкаў выяўлялі. Аматары гарэлкі яго баяцца як агню. Бо Паверany, акрамя ўсяго іншага, яшчэ і член савета аховы грамадскага правапарадку. Сочыць за тым, каб канфліктаў не было, каб мужыкі гарэлку не пілі і жонак не білі.

— Быў тут адзін скандаліст, жонку крыўдзіў, — кажа старшыня сельскага Савета Ганна Ціханава. — Мы некалькі разоў разглядалі яго на савеце, а Віктар Рыгоравіч асабіста кантраляваў, ці п'е. Той праз некаторы час закадзіраваўся.



**За добрасумленную працу.**

### Каб было прыгожа

Майскі па колькасці жыхароў — звычайная вёска, але чысціня і парадак тут — як на гарадскіх вуліцах. Некалькі гадоў таму за грошы, што Віктар Паверany атрымаў як пераможца спаборніцтва сярод кіраўнікоў органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, нават трактар купілі. На ім старшыня селькама вуліцы ўзімку расчышчае.

Вопыт барацьбы за чысціню і наогул уражвае. «Раней тут усюды звалкі былі, — кажа Паверany. — калі знаходзіў сярод смецця якую-небудзь квітанцыю, дзе прозвішча і адрас былі пазначаны, дык разам з мясцовым кіраўніцтвам ішоў у «госці» да гэтага чалавека. Так да парадку і прывучылі».

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

ІНІЦЫЯТЫВА

# Помнік сястры міласэрнасці з'явіцца ў Мокрай Дубраве

**У вёсцы Мокрая Дубрава Лагішынскага пасялковага савета Пінскага раёна вясной будзе ўстаноўлена кампазіцыя з памятнай дошкай гераіні Першай сусветнай вайны Рыме Івановай. Гэтая мужная дзяўчына, сястра міласэрнасці, загінула ў тутэйшых мясцінах у 1915 годзе.**



Рыма ІВАНОВА.

Бой за Мокрую Дубраву быў даволі жорсткім. Як высветлілі мясцовыя краязнаўцы, немцы наступалі на Лунінец. А невялікі гарнізон рускай арміі мужна абараняўся на подступах да згаданага населенага пункта. Так сталася, што ўсе афіцэры загінулі. І салдаты разгубіліся. Было ясна, што праз некаторы час яны разбягуцца ў розныя бакі. Некаторыя ўжо ў паніцы пачалі пакідаць акопы. Тады камандаванне байцамі ўзяла на сябе 21-гадовая сястра міласэрнасці Рыма Іванова. І стомленыя доўгім боем вайскоўцы сабраліся з духам — у такіх умовах яны не маглі паказаць сваю слабасць. Можна сказаць, здарыўся цуд: расійскія салдаты выстаялі і нават адагналі ворага. А сястрычка, якая выратавала жыццё многім на полі бою, атрымала смяротнае раненне і памерла на руках у байцоў. Цела яе потым перавезлі на радзіму, у Стаўрапаль. Пасмяротна Рыму Іванову ўзнагародзілі ваенным ордэнам святога Георгія IV ступені. Такой узнагароды ўдастоена адзіная жанчына ў Расійскай імперыі.

Пра тое, што каля Мокрай Дубравы адбыліся баі Першай сусветнай, заўсёды ведалі ў акрузе, а вось пра подзвіг юнай медсястры мала хто знаў. Старшыня Лагішынскага пасялковага Савета Канстанцін Шляжко расказаў, што ў лесе каля вёскі ёсць два вялікія пахаванні салдатаў — удзельнікаў тых баёў. У адным месцы знайшлі спачын нямецкія воіны, у другім — рускія. Гадоў дзесяць таму супрацоўнік тутэйшага лясніцтва Аляксей Пятровіч Балюк па ўласнай ініцыятыве зрабіў два бетонныя помнікі і ўстанавіў іх на магілах. Тады іх абгарадзілі і як маглі добраўпарадкавалі. І цяпер мясцовая ўлада клапоціцца пра вонкавы выгляд пахаванняў стагадовай даўніны. Да добрай справы падключылі школьнікаў. Вучні тутэйшай базавай школы кожную вясну высаджваюць кветкі, прыбіраюць на магілах. А заадно вывучаюць гісторыю свайго краю.

У Мокрай Дубраве сёння жыве каля 300 чалавек. Тут, акрамя школы, ёсць клуб, лясніцтва, ФАП, крамы. Вёска ў цэлым дагледжаная. Яе добраўпарадкаваннем мясцовая ўлада займаецца кожны год. На гэтую вясну плануецца закончыць устаноўку агароджы вакол могілак, «разабрацца» з калдобінамі на дарогах, якія ўтварыліся за зіму. Ну і, вядома, давядзецца істотна палепшыць тэрыторыю вакол клуба, каб устанавіць там памятны знак. Клуб знаходзіцца ў самым цэнтры вёскі — скульптурная кампазіцыя з трох валуноў і мемарыяльнай дошкі добра ўпішацца ў агульны краявід.

Памятную дошку ўжо зрабілі ў Мінску. Менавіта ў сталіцы нарадзілася ідэя ўвекавечыць імя юнай гераіні на месцы, дзе быў здзейснены подзвіг. Як расказала карэспандэнту «МС» загадчыца выхаваўчага аддзела сталічнага Інстытута правазнаўства Людміла Благапалучная, упершыню пра сястру міласэрнасці Рыму Іванову расказаў студэнт гэтай ВНУ, які родам з Пінска. Яго таварышы загарэліся ідэяй даведацца больш пра ўдзельніцу Першай сусветнай. Яны спісаліся са Стаўрапальскім музеем і атрымалі патрэбныя матэрыялы. Тады ў студэнцкага актыву ўзнікла думка ўвекавечыць памяць пра подзвіг Рымы Івановай. Будучыя юрысты ўсё рабілі самі: пісалі пісьмы ў Міністэрства культуры і іншыя ўстановы, узгаднялі эскіз будучай мемарыяльнай дошкі, арганізоўвалі правядзенне экспертызы. Адначасова збіралі грошы. Да збору сродкаў падключыліся і выкладчыкі. Калі патрэбная сума была ў наяўнасці, дошку заказалі ў майстэрні. І вось днямі сакратар камітэта БРСМ Вікторыя Кашко паведаміла, што мемарыяльная дошка гатова.

...Помнік плануецца ўстанавіць і ўрачыста адкрыць у красавіку. Спецыяліст аддзела ідэалогіі, культуры і па справах моладзі Пінскага райвыканкама Ірына Даніліна паведаміла нам, што пытанні ўстаноўкі помніка ўзгоднены на каардынацыйным савеце па гісторыка-культурнай спадчыне раёна. Засталося падрыхтаваць мерапрыемства і годна яго правесці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ХТО ХОЧА СТАЦЬ ДЭПУТАТАМ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— Як актывісты асобнай сацыяльнай групы — палітычнай партыі, яны, вядома, уяўляюць пэўны інтарэс, — канстатаваў спадар Лазавік. — Але не заўсёды людзі, якія атрымалі аўтарытэт у сваёй часта нешматлікай партыйнай арганізацыі, маюць такі ж аўтарытэт сярод непартыйнай грамадскай масы.

### Маладыя — не такія і маладыя

*Каля 5% ад усіх вылучэнцаў — маладыя людзі ўзростам да 30 гадоў.*

Паводле патрабаванняў Выбарчага кодэкса нашай краіны, у мясцовы Савет дэпутатаў можа быць выбраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 18-гадовага ўзросту, не мае судзімасці і пражывае на тэрыторыі адпаведнага Савета дэпутатаў. Тым не менш ці не вялікая гэта адказнасць — быць народным выбраннікам у тым узросце, калі некаторыя нават яшчэ не вызначыліся з прафесіяй? Ці маюць маладыя людзі дастаткова вопыту, каб рашаць праблемы мясцовага маштабу?

— Я не сказаў бы, што ў маладых няма вопыту, — не пагадзіўся Мікалай Лазавік. — Людзі, якія вылучаюцца кандыдатамі ў дэпутаты, — гэта ў большасці сваёй тыя, хто ўжо зразумеў на практыцы, што такое і вытворчая дзейнасць, і грамадская праца.

Сакратар Цэнтральнай камісіі ўпэўнены, што чалавека ва ўзросце 27-30 гадоў толькі ўмоўна можна называць маладым і недастаткова вопытным чалавекам.

— У свой час у 21 год я ўжо камандаваў ротай і нёс адказнасць за выкананне баявых задач падраздзяленнем у складзе 120 чалавек і 100 адзінак тэхнікі, — аргументаваў ён. — Так што калі малады чалавек, які працуе звычайным рабочым на вытворчасці ці выкладчыкам, вылучаецца кандыдатам у дэпутаты — значыць, ён ужо ведае, што такое жыццё. Ды і 5 % — гэта не так ужо і шмат. На маю думку, моладзі ў органах мясцовага самакіравання павінна быць значна больш, таму што потым з яе вырастуць і палітычныя дзеячы, і выдатныя гаспадарчыя кіраўнікі.

### Жаночы «складнік»

*Сярод тых, хто жадае стаць дэпутатам мясцовага Савета, жанчын прыкладна 46%.*

— На першасным узроўні прадстаўнічай улады жанчын вельмі шмат, — згаджаецца Лазавік. — Але чым вышэй узровень кіравання, тым жанчын застаецца менш.

Паводле слоў сакратара Цэнтральнай камісіі, больш за ўсё жанчын-дэпутатаў у мясцовых Саветах — сельскіх, пасялковых, раённых.

— На жаль, ужо на ўзроўні вобласці і рэспублікі працэнтныя суадносіны жанчын і мужчын складваюцца са значнай перавагай на карысць апошніх, — канстатаваў Мікалай Лазавік. — Чаму так? Тут ёсць і агульнасацыяльныя прычыны, і асабістыя. Выбаршчыкі (сярод якіх большасць — жанчыны) галасуюць чамусьці за мужчын. Напэўна, гэта таму, што мужчына больш думае пра агульныя, глабальныя праблемы, а жанчына — гэта захавальніца хатняга ачага. І яна, нават аддаючы сябе нейкай грамадскай працы, усё роўна застаецца ў першую чаргу, маці. Таму тыя складаныя задачы, якія ўзнікаюць і на больш высокіх узроўнях Саветаў, і ў дзяржаўным і вытворчым кіраванні, становяцца не проста непасільнымі, а нават непажаданымі для жанчыны, таму што патрабуюць занадта шмат часу, якога будзе не хапаць для сям'і.

### Кропкі над «і» расстаўляюць камісіі

*Да выбараў застаўся месяц, і цяпер тэрытарыяльныя і акруговыя камісіі маюць дастаткова працы.*

— Скончыўся перыяд вылучэння кандыдатаў у дэпутаты, і да 20 лютага акруговыя і тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі павінны праверыць усе дакументы, правесці пасяджэнне сваіх камісій і зарэгістраваць кандыдатаў у дэпутаты, — праінфармаваў Мікалай Лазавік. — Для праверак яны могуць прыцягваць дзяржаўныя органы, праводзіць ва ўстаноўленым законам парадку апытанні выбаршчыкаў, якія ставілі подпісы ў спецыяльных лістах, рабіць запыты ў органы, якія вядуць ўлік маёмасці, у падатковую інспекцыю. Але я амаль упэўнены, што нават раней за ўстаноўлены тэрмін уся гэта праца будзе скончана і кожная камісія прыме матываванае рашэнне аб рэгістрацыі кандыдатаў або аб адмове ў рэгістрацыі, калі будуць выяўлены заканадаўча абгрунтаваныя прычыны для гэтага.

### Дэбаты магчымы... у тэорыі

*Важным атрыбутам выбараў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, а таксама прэзідэнцкіх выбараў з'яўляюцца тэле- і радыёдэбаты.*

Для мясцовых выбараў такая магчымасць заканадаўча не прадугледжана, але дэпутаты могуць самі арганізаваць сумесныя выступленні перад выбаршчыкамі.

— Дэбаты законам не прадугледжаны, але тэарэтычна магчымыя, — падкрэсліў Мікалай Лазавік, — калі кандыдаты ў дэпутаты, якія балаціруюцца па адной выбарчай акрузе, арганізуюць сумесную сустрэчу са сваімі выбаршчыкамі. Там яны могуць выказаць сваё меркаванне па мясцовых, агульнапалітычных, сацыяльных праблемах. Але ўсё гэта ў тэорыі. Я не думаю, што нехта запросіць на сустрэчу з выбаршчыкамі свайго канкурэнта.

## А ЯК НА МЕСЦАХ?

Паводле слоў **Ігара БЕРАСЦЕНЯ, старшыні Пінскай гарадской выбарчай камісіі,** на 32 выбарчыя акругі Пінска заяўкі падалі 36 вылучэнцаў, на 5 акруг Брэсцкага абласнога Савета — 7. «Зараз камісія правярае прадстаўленыя ад вылучэнцаў дакументы, — распавёў Ігар Берасцень. — Парушэнняў заканадаўства пакуль што выяўлена не было. Думаю, усе вылучэнцы будуць зарэгістраваны». Ігар Берасцень звярнуў увагу на тое, што паралельна камісія працуе над тэкстамі для бюлетэняў. «Прасцей будзе ўжо потым, калі што, выкрасліць звесткі пра вылучэнца, які раптам не пройдзе праверку і не будзе зарэгістраваны», — патлумачыў старшыня Пінскай камісіі. Ён таксама праінфармаваў, што з 36 вылучэнцаў 16 — дзеючыя дэпутаты мясцовых Саветаў. «У асноўным гэта людзі сталыя, вопытныя, — адзначыў Ігар Берасцень. — Толькі 3 чалавекі маладзейшыя за 30 гадоў». Што да партыйнасці вылучэнцаў, то, паводле слоў старшыні камісіі, 4 вылучэнцы ў гарадскі Савет — прадстаўнікі Камуністычнай партыі Беларусі, у абласны — адзін — член партыі БНФ і адзін — Ліберальна-дэмакратычнай партыі. Паводле інфармацыі Берасценя, у Пінскі гарадскі Савет падалі заяўкі толькі 4 жанчыны.

**Генадзь ФІЛІПЕНКА, старшыня Віцебскай раённай выбарчай камісіі,** распавёў, што на 39 акруг вылучылася 39 ахвотных стаць дэпутатамі. «13 — шляхам збору подпісаў, 26 — ад працоўных калектываў», — удакладніў старшыня камісіі. Паводле яго інфармацыі, ад палітычных партый вылучэнцаў у Віцебскім раёне не было. З 39 ахвотных стаць дэпутатамі 7 жанчын. «Калі акрэсліць партрэт сярэднестатыстычнага вылучэнца, то гэта чалавек, які знаходзіцца на кіруючай пасадзе, яго ўзрост — ад 35 да 45 гадоў», — адзначыў спадар Філіпенка.

Як праінфармавала **сакратар Гомельскай гарадской выбарчай камісіі Ірына АБРАМЦАВА,** на 40 акруг Гомеля падалі дакументы 109 вылучэнцаў. «Традыцыйна шмат ахвотных стаць дэпутатамі ад Цэнтральнага раёна Гомеля, — адзначыла сакратар камісіі. — Але ёсць 8 акруг, дзе вылучана па адным чалавеку. Там будуць безальтэрнатыўныя выбары». Паводле слоў Ірыны Абрамцавай, самаму маладому вылучэнцу — 22 гады, а самаму старэйшаму — 78. «Актыўна сябе праявілі асобы пенсійнага ўзросту: іх 14% ад усіх вылучэнцаў, — звярнула ўвагу сакратар камісіі. — Шмат маладых людзей ва ўзросце да 30 гадоў — іх 10% ад агульнай колькасці тых, хто хоча стаць дэпутатамі». Па інфармацыі Абрамцавай, ад палітычных партый у Гомелі вылучылася 36 чалавек — актывісты Беларускай партыі левых «Справядлівы свет», Камуністычнай партыі Беларусі, Аб'яднанай грамадзянскай партыі, Сацыял-дэмакратычнай партыі народнай згоды. Ірына Абрамцава адзначыла, што цяпер камісія правярае ўсе дакументы, якія падалі для рэгістрацыі вылучэнцы.

**Віктар ГАРБАНЁЎ, старшыня Бабруйскай гарадской выбарчай камісіі,** адзначыў, што на 40 акруг горада вылучылася 97 прэтэндэнтаў. Асноўная маса — ад працоўных калектываў. «За права назвацца народным выбраннікам будуць змагацца кіраўнікі прадпрыемстваў, бібліятэкары, настаўнікі, рабочыя, — распавёў Гарбанёў. — Ёсць нават адзін студэнт-пяцікурснік». Што цікава, у Бабруйску вылучэнцаў-жанчын прыкладна столькі ж, колькі і мужчын.

# КАБ ФІНАНСЫ НЕ СПЯВАЛІ РАМАНСАЎ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

**— Гэта адзіная мера ўмацавання бюджэтаў пярвічнага ўзроўню?**

— Не. Якраз цяпер ідзе праца над унясеннем змяненняў у закон аб мясцовым кіраванні і самакіраванні, а таксама ў Бюджэтны кодэкс. Плануецца даць права Саветам дэпутатаў пярвічнага ўзроўню выдаткоўваць сродкі на фінансаванне будаўнічай дзейнасці на месцах. Гэтае новаўвядзенне паспрыяе стварэнню доўгатэрміновых каштоўнасцяў за кошт пярвічных бюджэтаў і паслужыць умацаванню самастойнасці кожнага з гэтых бюджэтаў.

Хачу нагадаць, што рэшткі сродкаў бюджэту, якія ўтварыліся на канец справаздачнага фінансавага года, застаюцца ў распараджэнні адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў і іх адабранне з бюджэту не дапускаецца. Выкарыстанне рэшткаў сродкаў бюджэту, якія ўтварыліся на пачатак гэтага фінансавага года, ажыццяўляецца рашэннем мясцовага Савета дэпутатаў. На працягу фінансавага года гэтыя рэшткі могуць выкарыстоўвацца, у тым ліку выканкамамі пярвічнага ўзроўню, для пакрыцця часовых касавых разрываў, якія ўзнікаюць пры выкананні мясцовых бюджэтаў, з іх аднаўленнем да заканчэння фінансавага года.

**— Якія новаўвядзенні сёлета закрануць мясцовыя бюджэты ўвогуле?**

— У мясцовых бюджэтах з'явіліся новыя даходныя крыніцы. У прыватнасці, уводзіцца адзіны падатак на даход, атрыманы ад ажыццяўлення дзейнасці па аказанні паслуг па тэхнічным абслугоўванні і рамонце аўтамотатранспартных сродкаў і іх кампанентаў. Ён у поўным аб'ёме залічваецца ў бюджэты базавага ўзроўню.

Сярод новых непадатковых крыніц даходаў — дзяржаўная пошліна за выдачу дазволу на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху. Пошліна будзе спаганяцца на тэрыторыі Беларусі і размяркоўвацца пароўну паміж рэспубліканскім і мясцовым бюджэтамі. Гэтыя сродкі пойдуць на паляпшэнне якасці дарог і вуліц нашай краіны. Папярэдне, паводле падлікаў Міністэрства фінансаў, мясцовыя бюджэты атрымаюць у выглядзе вышэйназванай дзяржаўнай пошліны дадаткова каля 800 млрд рублёў.

Акрамя таго, з мясцовых бюджэтаў выведзена такая рызыкоўная крыніца даходаў, як падатак на прыбытак рэспубліканскіх арганізацый. Цяпер ён у поўным аб'ёме залічваецца ў рэспубліканскі бюджэт. Гэта зроблена для таго, каб мясцовыя бюджэты не залежалі ад вынікаў дзейнасці рэспубліканскіх арганізацый. Каб, напрыклад, прадухіліць леташнюю складаную сітуацыю, калі бюджэт Мінскай вобласці недаатрымаў грошай з-за пагаршэння паказчыкаў фінансава-гаспадарчай дзейнасці асноўнага падаткаплацельшчыка ААТ «Беларуськалій» і быў вымушаны істотна скараціць першапачаткова запланаваныя расходы.

Пры гэтым нарматыў адлічэння ў мясцовыя бюджэты ад такой значнай даходнай крыніцы, як падатак на дабаўленую вартасць, павялічаны з 30% да 31%. Ён размяркоўваецца паміж абласцямі і горадам Мінскам празрыста — прапарцыянальна колькасці жыхароў.

**— Якім чынам параіце кіраўнікам на месцах папаўняць свае бюджэты? Якія даходныя крыніцы, на ваш погляд, варта было б развіваць больш актыўна?**

— Шлях адзіны: садзейнічаць стварэнню спрыяльнага інвестыцыйнага клімату ў сваім рэгіёне, ствараць эфектыўныя прадпрыемствы і, безумоўна, паляпшаць дзейнасць тых арганізацый, якія ўжо функцыянуюць. Гэта выгадна, бо падатак на прыбытак камунальных і недзяржаўных прадпрыемстваў цалкам застаецца ў мясцовых бюджэтах. Тое ж самае тычыцца і падаходнага падатку з фізічных асоб. Да слова, па выніках мінулага года падаходны падатак — істотная крыніца мясцовых бюджэтаў. Тут нават назіраецца перавыкананне адносна першапачаткова зацверджаных паказчыкаў у сувязі з ростам заработнай платы.

Асабіста я выступаю за стварэнне камунальных унітарных прадпрыемстваў (КУПаў). У якасці ўзору добрага гаспадарання на пярвічным узроўні можна назваць Опыльскі сельсавет, што ў Іванаўскім раёне. Прадпрыемства там працуе эфектыўна. У якасці доказу прывяду лічбы: толькі летась бюджэт сельсавета атрымаў больш за 60 млн рублёў у выглядзе часткі прыбытку ад дзейнасці гэтага ўнітарнага прадпрыемства. Больш за тое, КУП не толькі наводзіць парадак на сваёй тэрыторыі, але і выконвае заказы іншых сельсаветаў...



Толькі падумайце, як можна было б аблегчыць нагрузку на бюджэты пярвічнага ўзроўню, калі б у большасці сельсаветаў быў бы такі прыбытковы КУП! Цудоўныя вынікі работы і, у першую чаргу, гэта можна сказаць у адрас людзей, якія за ўсім гэтым стаяць.

**— Наколькі актыўна жыхары сельсаветаў удзельнічаюць сваім рублём у добраўпарадкаванні малой радзімы?**

— У цэлым па краіне ў мясцовыя бюджэты ў якасці сродкаў самаабкладання за мінулы год паступіла 3,4 млрд рублёў. Гістарычна склалася так, што найбольш актыўныя ў гэтым сэнсе людзі жывуць на Гомельшчыне. Напрыклад, у Хальчанскім сельсавеце Веткаўскага раёна летась сабралі больш як 80 млн рублёў, у Пабалоўскім сельсавеце Рагачоўскага раёна — больш за 70 млн рублёў. Людзі разумеюць, што бюджэт не гумавы, на ўсё ў адзін момант грошай не хопіць, таму ўносяць пасільны ўклад у навядзенне парадку ў населеных пунктах.

**— Таццяна Анатольеўна, раскажыце падрабязней, якія сферы патрабуюць найбольшых грашовых уліванняў?**

— Асноўныя напрамкі расходаў у бюджэтах рэгіёнаў — гэта забеспячэнне функцыянавання ўстаноў адукацыі, аховы здароўя, субсідзіраванне дзейнасці мясцовай ЖКГ. Менавіта гэтыя расходы напрамую звязаны з рэалізацыяй мер сацыяльнай абароненасці нашых грамадзян.

Каб накіраваць расходы мясцовых бюджэтаў у правільнае рэчышча, у Бюджэтны кодэкс і ў закон аб бюджэце былі ўнесены новыя нормы. У першую чаргу мясцовы бюджэт павінен забяспечваць гарантаваны пакет сацыяльных паслуг насельніцтву. Вядома, добраўпарадкаванне і капітальныя расходы — набыццё абсталявання, капітальны рамонт, капітальнае будаўніцтва — гэта вельмі важна. Але ў першую чаргу мы павінны турбавацца пра тое, каб у нашых паліклініках і бальніцах былі ў наяўнасці патрэбныя медыкаменты, каб было забяспечана харчаванне дзяцей у навучальных установах, каб своечасова і ў поўным аб'ёме плацілі зарплату работнікам бюджэтнай сферы, каб субсідзіраваліся камунальная гаспадарка і транспарт, своечасова выконваліся абавязкі па запазычаннях.

Больш за тое, акрамя нарматыву забяспечанасці па расходах у галіне аховы здароўя, з гэтага года ўведзены нарматыў бюджэтнай забяспечанасці расходаў на адукацыю. Іншымі словамі, зафіксаваны мінімальны аб'ём сродкаў, які мясцовым уладам неабходна захаваць на патрэбы гэтай галіны. Такое рашэнне павінна паспрыяць у тым ліку і павышэнню зарплаты работнікаў адукацыі, што вельмі важна.

**— Не сакрэт, што дадатковыя рэсурсы могуць з'явіцца не толькі ад атрымання дадатковых даходаў, але і за кошт аптымізацыі расходаў...**

— Так, гэта вельмі актуальна ў сённяшніх рэаліях. Таму задача сельсаветаў — больш актыўна ўцягваць у гаспадарчы абарот камунальную маёмасць і зямельныя ўчасткі, якія не выкарыстоўваюцца, ствараць эфектыўныя КУПы... Адным словам, ва ўмовах недастатковасці бюджэтных грошай найбольшую каштоўнасць набывае такая якасць дзяржаўнага служачага, як магчымасць быць дбайным гаспадаром — каб найбольш рацыянальна, эфектыўна распарадзіцца тымі сродкамі, якія ёсць.

Акрамя таго, расходы на забеспячэнне дзейнасці непасрэдна саміх органаў кіравання на месцах могуць быць значна аптымізаваны. Па правільным шляху ідзе Мінскай вобласць. Я маю на ўвазе ўзбуйненні сельсаветаў. Так, калі ў 2012 годзе на Міншчыне быў 281 бюджэт пярвічнага ўзроўню, то ў 2014 годзе іх застанецца 225. Як вынік — эканомяцца бюджэтныя сродкі на ўтрыманне апарату кіравання сельсавета, а сэканомленыя грошы, безумоўна, пойдуць на добраўпарадкаванне тэрыторый. Вельмі добрая практыка, яе трэба мець на ўвазе іншым рэгіёнам і ажыццяўляць удасканаленне дзейнасці дзяржаўных устаноў, улічваючы пры гэтым інтарэсы грамадзян.

**Асноўнымі крыніцамі даходаў мясцовых бюджэтаў сёння з'яўляюцца:**
**падатак на прыбытак, які выплачваецца камунальнымі і недзяржаўнымі арганізацыямі, падаходны падатак, падаткі на ўласнасць і адлічэнні ад падатку на дабаўленую вартасць. Усе мясцовыя бюджэты пастаўлены ў роўныя ўмовы, каб зарабляць уласныя грошы, каб самастойна нарошчваць свой патэнцыял за кошт павышэння эфектыўнасці дзейнасці прадпрыемстваў, — незалежна ад таго, камунальная арганізацыя гэта альбо прадпрымальніцкая структура.**

# СВОЙ СЯРОД СВАІХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»).*

На сваім «камунальным» участку ён стварыў моладзевую вытворчую брыгаду, якая была прызнана ў раёне лепшай у сферы абслугоўвання. А будаўнічы атрад з ліку старшакласнікаў Майскага вучэбна-педагагічнага комплексу, якім ён кіраваў, стаў пераможцам раённага конкурсу працоўнага семестра. Такі марафет з падлеткамі навялі, што не сорамна нават замежныя дэлегацыі запрашаць. Зрабілі прыгожую дзіцячую пляцоўку, клумбы. Старшакласнікам так спадабалася працаваць пад кіраўніцтвам Паверанага, што некаторыя пасля заканчэння школы засталіся ў мясцовай гаспадарцы.

### Лепшы адпачынак — гэта... праца

— У Віктара Рыгоравіча залатыя рукі і бескарыслівая душа, — кажа пра Паверанага старшыня Чэрыкаўскага раённага Савета дэпутатаў Наталля Гатоўчык. — Калі даеш яму даручэнне, можна не сумнявацца: выканае. Ён нават у адпачынак ідзе дзеля таго, каб папрацаваць на ўборцы ўраджаю.

Здзіўляе адно: як чалавек усюды паспявае? Камбайн, на якім ён працуе падчас уборачнай, самы дагледжаны. Камунальная гаспадарка таксама функцыянуе спраўна. Аб яго добрасумленнасці сведчаць дзясяткі два грамат і падзяк розных узроўняў і ганаровы знак работніка жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

— Трэба працаваць так, каб не сорамна перад іншымі было, — лічыць ён. — Ды і самому прыемна, калі ўсё па-гаспадарску робіцца. Летам тут траву косім, каб тэрыторыя прывабна выглядала. І пра вёскі, што навокал, не забываем. Там жа адны пенсіянеры жывуць. Хто ім дапаможа? Могілкі даглядаем, агароджу рамантуем, дрэвы аварыйныя спілоўваем... За ўсім трэба глядзець.

— Жонка з дому яшчэ не гоніць? У вас жа ўсё справы ды справы, — пытаюся ў Паверанага.

— Дык мы ж з ёю разам і працуем, — усміхаецца Віктар Рыгоравіч. — Яна справаздачы робіць — гэта для мяне самае цяжкае. А без іх зарплату не атрымаеш.

Напярэдадзе — новыя планы.

— У нас ёсць усе магчымасці, каб вырошчваць статак кароў, — дзеліцца няўрымслівы Паверань. — Трэба падумаць, як комплекс пад жывёлу зрабіць.

І мне здаецца, усё ў яго атрымаецца. Такі ён чалавек.

**Фота аўтара.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ. ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.
Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.
**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 44 12;
**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**
**Тыраж 22.315. Нумар падпісаны ў 19.30 19 лютага 2014 года.**

■ Гаючая сіла

# ЛЕЧАЦЬ «ЖЫВОЙ» І «МЁРТВАЙ» ВАДОЙ

**Лячэнне «жывой» і «мёртвай» вадой — новая пакуль што эксклюзіўная сярод дзяржаўных медыцынскіх устаноў прапанова Віцебскага абласнога скурна-венерычнага дыспансера. Паводле слоў Віктара Спірыдонава, кіраўніка гэтай медыцынскай установы, нетрадыцыйныя метады лячэння — «фішка» ў дзейнасці дыспансера. Тут ужо паспяхова папраўляюць здароўе пацыенты пры дапамозе ўкусаў пчол, а таксама п'явак, выкарыстоўваецца фіш-тэрапія і гэтак далей. А лячэнне «жывой» і «мёртвай» вадой — навінка. Ужо праводзілі пробныя сеансы. Кошт кожнага — усяго 1,5 тысячы рублёў.**

Галоўны ўрач растлумачыў, што звычайная вада становіцца карыснай пасля яе апрацоўкі шляхам электролізу. Адпаведны прыбор для апрацоўкі вады, дарэчы, выраблены ў Мінску. Электрычны ток, які праходзіць праз ваду, змяняе яе ўнутраную структуру. Для кожнага хворага выпрацоўваецца індывідуальная праграма лячэння. Пасля электролізу вада падзяляецца на дзве фракцыі, якія валодаюць гаючымі ўласцівасцямі. Пры лячэнні хвароб «жывую» і «мёртвую» ваду п'юць у розных спалучэннях у залежнасці ад віду захворвання.

«Жывая» вада — добры стымулятар, танізатар, крыніца энергіі. Прыводзіць у рух увесь арганізм, прыдае энергію, бадзёрасць, спрыяе рэгенерацыі клетак, загойвае раны... «Мёртвая» вада — выдатны дэзынфектар. Рэкамендуецца яе піць для прафілактыкі і лячэння прастудных захворванняў, грыпу, ангіны. Такая вада паніжае ціск, супакойвае нервовую сістэму, паляпшае сон, паніжае боль у суставах, хутка дапамагае пры расстройстве кішэчніка.

Як падкрэслілі медыкі, сумеснае прымяненне «жывой» і «мёртвай» вады дапамагае змагацца з многімі хваробамі: герпесам, грыбковымі захворваннямі, псарыязам, прастатытам і гэтак далей. Штучна актывізаваную ваду ўжо даўно ўжываюць для лячэння хворых у такіх краінах, як Японія, Аўстрыя, Германія, Ізраіль, Індыя... Яшчэ ў савецкія гады — напрыканцы 1980-х — бяспечнасць прымянення такой вады пацвердзіў фармакалагічны камітэт СССР.

Віцебскія медыкі таксама плануюць лячыць хворых... біяполем пчол. Якія не кусаюць чалавека, а лечаць яго, знаходзячыся побач за шклом. Ужо замовілі спецыяльны «домік» для правядзення сеансаў. Вядома, што аналагічным чынам ужо даўно падтрымлівае сябе ў форме прэзідэнт Украіны.

— Нетрадыцыйныя метады лячэння становяцца ўсё больш папулярнымі. Летась мы аказалі платных паслуг на суму 6,6 мільярда рублёў — гэта 45% ад памеру нашага фінансавання з бюджэту. У параўнанні з пазамінулым годам, рост платных паслуг — 130%. На абслугоўванні іншаземцаў зарабілі каля 50 тысяч долараў. Прыязджаюць лячыцца ў Віцебск не толькі расіяне, але і жыхары далёкага замежжа. Сярод нашых пацыентаў ёсць і вельмі багатыя людзі. У прыватнасці, у нас праходзіў лячэнне расійскі бізнесмен, які прыязджаў у госці ў Беларусь да сваёй сястры. Лячыўся ад псарыязу і застаўся вельмі задаволены не толькі высокім класам спецыялістаў, але і добрымі ўмовамі лячэння. Лячылі і грамадзяніна ЗША, якому прызначылі ў Амерыцы шасцімесячны курс прыёму антыбіётыкаў. Мы яму паставілі дыягназ і прызначылі метад лячэння. Аказвалі медыцынскія паслугі і грамадзянам Германіі, Украіны. Мінчанін прыязджаў па льняное абгортванне, — расказвае Віктар Спірыдонаў.

Вельмі запатрабаванымі сталі такія паслугі дыспансера, як «Асабісты дэрматолаг» і «Асабісты венеролаг». Апраўдалі сябе тэлемедыцына і анлайн-кансультацыі.

У планах адкрыццё ў стацыянарах дыспансера... інтэрнэт—кавярняў. За невялікую плату хворыя змогуць бавіць час у сусветным павуцінні, не выходзячы з лячэбнай установы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

# «ПАЛЯВАННЕ» НА ЗЛОДЗЕЯ

## «Чатыры з пяці крадзяжоў адбываюцца шляхам вольнага доступу»

— За апошнія гады крадзяжоў у сталіцы значна паменела, — гаворыць **супрацоўнік аддзела па раскрыцці кватэрных крадзяжоў упраўлення крымінальнага вышуку крымінальнай міліцыі ГУУС Мінскага гарвыканкама Яўген БОКІЙ.**

Садзейнічае гэтаму актыўная прафілактычная праца, у тым ліку і з раней судзімымі асобамі. Справа ў тым, што кватэрная кража лічыцца кваліфікаваным злачынствам, на якое пераважна ідуць людзі, якія ўжо неаднойчы дагэтуль канфліктавалі з законам.

Аднак летась мы зарэгістравалі прыблізна паўтары тысячы такіх выпадкаў. Прычым восемдзесят працэнтаў з іх адбыліся шляхам вольнага доступу! Гэта значыць, што кожны дзень пад прыцэл аматараў чужога дабра трапляюць чатыры-пяць мінскіх кватэр і прыватных дамоў. Раскрываецца ж сем з дзесяці такіх злачынстваў.



## Не трэба геройнічаць

Уявіце сабе наступную сітуацыю. Вы — паляўнічы, а значыць, маеце дазвол на захоўванне зброі. Стрэльба вісіць у вашай хаце на сцяне. Уначы вас абуджае звон разбітага шкла. Першая думка: у хату забраўся злодзей. Імкліва зрываеце са сцяны стрэльбу, перазараджаеце зброю, урываецеся ў пакой і бачыце, як няпрошаны госць на кухні набівае мяшок нажытым дабром. Вы прыцэліліся. Блiснула полымя, грымнуў стрэл... Злодзей ляжыць на падлозе паранены або забіты. А што далей? Гэта ў кіно герой заўжды выходзіць сухім з вады. У нашай жа рэальнасці меч Феміды можа паразіць самога гаспадара...

— Нячаста, але такія «рандэву» адбываюцца. Хутчэй, можна казаць пра іх выпадковы характар, бо злодзей, вядома ж, аддае перавагу таму, каб застацца інкогніта, — канстатуе Яўген Бокій. — Свежы прыклад адбыўся ўжо сёлета. Гаспадар адпачываў у кватэры пасля начной змены. Яго ўвагу прыцягнулі нейкія незразумелыя гукі. Нібыта хтосьці корпаўся ў замку. Ён адчыніў дзверы і ўбачыў дваіх , якія тут жа рэціраваліся. Па гэтым факце заведзена крымінальная справа па артыкуле 205 Крымінальнага кодэкса, як на замах на здзяйсненне кватэрнай кражы.

Лепш за ўсё злодзею не перашкаджаць у яго намерах збегчы. Ён нечым нагадвае па сваіх паводзінах зацкаванага звера, якому можа прыйсці ў галаву немаведама што, каб вырвацца з пасткі на волю. І хто ведае, што можа ляжаць у яго кішэні?

Яўген Бокій прыгадвае адну справу, па якой ужо асуджаны вінаватыя. Муж і жонка прыйшлі дадому і ўбачылі вырваную сарцавіну замка. Як толькі яны адчынілі дзверы, ім насустрач кінуліся два хлопцы. У аднаго з іх у руцэ быў кухонны нож, які, як высветлілася пасля, быў таксама ўкрадзены з кватэры. Муж і жонка проста саступілі ім дарогу. І прынялі правільнае рашэнне — не сталі геройнічаць з рызыкай для ўласнага жыцця. Усё гэта было кваліфікавана як кватэрны разбой.

Самае галоўнае ў крытычнай сітуацыі — не паддавацца эмоцыям, а як мага хутчэй выклікаць міліцыю. Адразу ж называць прыкметы, адрас і напрамак, куды пабег няўдалы злачынца. Бліжэйшы нарад патрульна-паставой службы ці ўнутраных войск у лічаныя хвіліны атрымае патрэбную інфармацыю, і шанцы затрымаць злодзея па «гарачых слядах» рэзка павялічваюцца. Гэтак было ўжо неаднойчы. Больш за тое, пацярпелы можа дапамагчы ў складанні базы доказаў, якая дапаможа пры апазнанні злачынцы. А як правіла, такія ўчынкі носяць сістэмны, серыйны характар.

— Калі ж сутычкі пазбегнуць усё ж не ўдалося, то ўсё роўна трэба памятаць аб тым, што закон можа павярнуцца і супраць абрабаванага, — нагадвае суразмоўца. — Першае правіла, якое павінен выконваць пацярпелы, — гэта сувымернасць шкоды. Па магчымасці, лепшае для гаспадара — затрымаць аматара чужога з нанясеннем мінімальнай шкоды яго здароўю.

**МАЙ НА ЎВАЗЕ!**

***Якія ж артыкулы Крымінальнага кодэкса павінен ведаць гаспадар, каб самому не змяніць хатні адрас на турэмны?***

❍ Артыкул 144. Прычыненне смерці па неасцярожнасці караецца папраўчымі работамі да двух гадоў, або абмежаваннем волі да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін. Калі ж жыццё было адабрана ў дзвюх ці больш асоб, то тэрмін за кратамі павялічваецца да пяці гадоў.

❍ Артыкул 151. Наўмыснае нанясенне цяжкага або менш цяжкага пашкоджання пры перавышэнні мер, неабходных для затрымання злачынцы. Максімальная санкцыя — да трох гадоў абмежавання волі.

❍ Артыкул 153. Наўмыснае нанясенне лёгкага цялеснага пашкоджання. Самы горшы расклад можа прывесці да трох месяцаў арышту.

## Аб'ектыў супраць злодзея

А вось прысядзібны ўчастак лепш за ўсё абсталяваць відэакамерамі, калі на гэта, вядома, ёсць грошы. Людзі, якія жадаюць крыху сэканоміць, ставяць не сапраўдныя апараты, а іх муляжы. Ці дапамагаюць яны — іншая справа.

Трэба паставіць добры плот. Разабраць цагляную ці бетонную агароджу куды складаней, чым адарваць дзве-тры струхнелыя дошкі. Некаторыя дачнікі рашаюць падрыхтаваць «сюрпрыз» для злодзея і ўпотай працягваюць калючы дрот. Ды вось толькі за яго выкарыстанне можна трапіць на лаву падсудных і самому: калі той жа зламыснік моцна параніцца.

— Значная доля злачынстваў здзяйсняецца менавіта ў прыватным сектары. Некаторыя грамадзяне паводзяць сябе так, як быццам яны жывуць дзесьці ў глухамані, дзе ўсе ўсіх ведаюць і давяраюць адно аднаму. Але, напрыклад, сталіца — гэта вельмі прывабнае месца для тых жа гастралёраў. Таму абавязкова падтрымлівайце добрыя стасункі з суседзямі, — раіць суразмоўца. — Калі яны заўважаць у вашым двары кагосьці незнаёмага, то патэлефануюць у міліцыю.

❍❍❍

Лепшага сродку для аховы жылля, чым ахоўная сігналізацыя, пакуль не прыдумана. Пры яе ўстаноўцы спецыялісты раяць не эканоміць. Многія блакіруюць толькі ўваход ці дзверы і вокны. Аднак небяспека можа падсцерагаць і з іншага боку. Зусім нядаўна ў Дзяржынску зладзеі хацелі абрабаваць краму, праламаўшы сценку. Дзевяць гадоў таму ў Мінску злачынцам вельмі «палюбіліся» вентыляцыйныя шахты. Таму поўнасцю абароняць ад няпрошаных гасцей хіба што датчыкі руху.

Хтосьці дома пакідае сабаку байцоўскай пароды, каб «правучыць» злодзея. Але і гэта не панацэя: з жывёламі таксама могуць расправіцца. І самыя «наварочаныя» замкі і дзверы не ўратуюць на сто працэнтаў. Усе механізмы, што стварыў чалавек, тэарэтычна можна адчыніць...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Зачапіла

# ХТО ЗАБЫВАЕ РОХКАЦЬ?




**Сапраўды, колькі можна заклікаць суайчыннікаў не смеціць на вуліцах і дарогах, не выкідваць бытавыя адходы з балконаў і вокнаў машын? Не заклікаць, а сказаць, хто яны ёсць насамрэч, вырашылі аўтары сацыяльнай рэкламы і ўмацавалі вось такія білборды. Вельмі трапна і дасціпна падмечана, згадзіцеся. На жаль, пакуль малавата падобнай нагляднай агітацыі. Але галоўнае — пачатак. У Брэсце білборд з'явіўся на вуліцы Маскоўскай, якая пераходзіць у трасу М1.**

А можа, варта размножыць такія плакаты і развесіць у кожным пад'ездзе, дзе неахайныя жыльцы маюць завядзёнку кідаць прама пад ногі абгорткі цукерак і жуек, рэкламную макулатуру з паштовых скрынак і іншае смецце. А яшчэ добра было б устанавіць яе ў вокнах тых, хто курыць на балконах і кідае акуркі з акна. Вось ім бы — прымусова — павесіць палотны з такім надпісам замест жалюзі і фіранак...

Нядрэнна было б змясціць наглядную агітацыю на рэках і азёрах, дзе цяпер шмат ахвотных да зімовай рыбалкі і дзе супрацоўнікі прыродаахоўнай інспекцыі мяхамі збіраюць бутэлькі і іншую тару, якую рыбакі пакідаюць пасля «сугрэву». Трэба думаць, кідаюць і не рохкаюць...

Вельмі хацелася б, каб сацыяльная рэклама хоць крыху паўплывала на свядомасць тых, хто мае звычку засмечваць навакольнае асяроддзе, і такім чынам залазіць у нашу з вамі кішэню. Сродкі на прыбіранне за тымі, каго заклікаюць рохкаць, бяруцца з нашых падаткаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ. Фота аўтара**

■

# У чым соль конкурсу?

**ААТ «Мазырсоль» стала лаўрэатам конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь 2013 года», які быў абвешчаны і праведзены Дзяржаўным камітэтам па стандартызацыі.**

Як паведамілі ў прэс-службе канцэрна «Белдзяржхарчпрам», павараная харчовая выварная ёдаваная соль «Палессе», якая выпрацоўваецца пад таварным знакам «Залаты зубр», стала лаўрэатам конкурсу ў намінацыі «Харчовыя тавары». А новы від прадукцыі — грануляваная соль для пасудамыйных машын, фасаваная ў кардонныя пачкі па два кілаграмы, перамагла ў намінацыі «Прамысловыя тавары для насельніцтва і вырабы народных промыслаў». Ёй прысуджаны статус «Навінка года».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Супраць залежнасці

# «ДВАНАЦЦАЦЬ КРОКАЎ» ДА ЦВЯРОЗАСЦІ

## Магчыма, дапамогуць Ананімныя Алкаголікі



**Групы Ананімных Алкаголікаў (АА) дзейнічаюць прыкладна ў 180 краінах свету. Каля 70 такіх груп ёсць і ў нашай краіне. Дакладных звестак пра колькасць груп і членаў у іх не існуе, паколькі дзейнасць АА рэгламентуе жаданне працаваць над сабой і дапамагаць у гэтым іншым паводле некаторых прынцыпаў. Гэтыя прынцыпы называюцца «Дванаццаць традыцый» або «Дванаццаць крокаў». Прыдумалі іх шмат гадоў таму далёка ад нашай краіны. Час паказаў, што традыцыі нядрэнна працуюць і дапамагаюць заставацца цвярозымі многім залежным. Удзел у групах АА — не панацэя. Многія зрываюцца і зноў вяртаюцца да «крокаў». Вось што думаюць пра сваё членства ў АА самі прадстаўнікі такой садружнасці.**

***Дзмітрый:***

— Алкаголь для алкаголіка — алерген. У тым сэнсе, што любыя алкагольныя напоі ў любой колькасці гэтаму чалавеку проціпаказаны. Як толькі ў яго жыцці ўзнікае першая чарка, яна тут жа ператвараецца ў... акіян. Бо алкаголік не можа спыніцца. Слова «мера» — не для яго. Адначасова алкаголік пераконвае сябе, што можна неяк навучыцца піць «правільна», «як усе», што ніякай залежнасці ў яго няма. Такі чалавек заўсёды неспакойны, раздражнёны і незадаволены... Што б ні мянялася ў жыцці, алкаголік працягвае выпіваць, у адрозненне, скажам, ад таго, хто пры пэўнай змене абставін здольны спыніцца.

***Канстанцін:***

— Садружнасць АА, якая дзейнічае ў Беларусі амаль 25 гадоў, нікога не агітуе і не зацягвае сілай. Хвораму не даюць ніякіх прагнозаў і абяцанняў, не прадастаўляюць ні лячэння, ні рэабілітацыі. Хоць, вядома, у садружнасці ёсць, як мы кажам, сябры — з ліку тых жа ўрачоў-нарколагаў. Ніхто не вырашае тут шматлікія бытавыя ці сямейныя праблемы. Алкаголіку забяспечваецца галоўнае — магчымасць быць і заставацца цвярозым. А застаючыся цвярозым, можна вырашыць любыя праблемы.

***Сяргей:***

— Размова ідзе пра добраахвотную суполку мужчын і жанчын, якія сустракаюцца для таго, каб падтрымліваць цвярозасць. Адзінай умовай удзелу з'яўляецца жаданне кінуць піць. У АА няма ніякіх узносаў і аплаты. Сходы суполкі праходзяць у памяшканнях, якія належаць розным канфесіям і наркалагічным установам. Гэта не больш чым арэнда памяшкання за мінімальную плату.

**Намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Сацыяльна-педагагічнага цэнтра Маскоўскага раёна г. Мінска Алена КАЖАКІНА:**

— Праблема п'янства і алкагалізму актуальная для нашага раёна, дзе 221 дзіця знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. У абсалютнай большасці выпадкаў у гэтым «вінаватыя» бацькі, якія злоўжываюць алкаголем. На базе цэнтра працуе і дзіцячы прытулак. А з 2009 года ў нас пачала сваю работу група Ананімных Алкаголікаў. Некаторыя бацькі пачалі мяняцца менавіта праз наведванне сходаў гэтай групы. А калі бацькі пачалі мяняцца, значыць, у дзіцяці ёсць шанцы вярнуцца ў біялагічную сям'ю.

## Да роздуму

**Ці алкаголік я?**

Я вырашаю, што не буду выпіваць. Але выпіваю. І напіваюся. Потым зноў вырашаю... і зноў напіваюся. Я нават не разумею, як у мяне гэта атрымліваецца. Кожная выпіўка становіцца не проста пытаннем разбурэння майго здароўя. Самыя розныя праблемы нарастаюць як снежны ком. Не члены АА, і нават не ўрач павінны вынесці мне дыягназ. Я сам павінен прызнаць сваю залежнасць.

**Што рабіць, калі мяне непакоіць маё п'янства?**

Шукаць дапамогі. Магчыма, мне дапамогуць Ананімныя Алкаголікі.

**Што рабіць, каб уступіць у АА?**

Толькі жадаць кінуць выпіўку. Аднак многія не былі ўпэўнены ў гэтым жаданні, калі прыходзілі ў АА. Пазней гэта жаданне набірала сілу.

**Да чаго мяне абавяжуць наведванні сходаў АА?**

Ні да чаго. Тут не вядуць рэгістрацыі членаў, не цікавяцца гісторыямі захворвання. Ніхто не будзе кантраляваць, ці прыйдзеш ты на наступны сход. Ніхто не будзе пытацца тваё прозвішча. Дастаткова назваць імя (або выдуманае імя), каб да цябе маглі звяртацца.

**Пра што размаўляюць на сходах АА?**

Ёсць розныя віды сходаў. Галоўным чынам, на іх алкаголікі дзеляцца ўласным вопытам выздараўлення. Яны расказваюць, як алкаголь паўплываў на іх жыццё, што яны зрабілі, каб застацца цвярозымі. Той, каму не хочацца гаварыць, можа заставацца проста слухачом.

**Як гэта можа дапамагчы?**

Садружнасць АА працуе па праграме «Дванаццаць крокаў». Гэтыя крокі вядуць да выздараўлення. Адзін алкаголік размаўляе з другім. І гэта працуе!

**Чаму на сходы працягваюць хадзіць тыя, хто выздаравеў?**

Вылечыцца ад алкагалізму нельга. Гэта значыць, алкаголік ніколі не зможа нармальна піць. Здольнасць захоўваць цвярозасць залежыць ад фізічнага, псіхічнага і духоўнага выздараўлення. Гэтага дазваляюць дасягнуць сходы АА і прымяненне ў жыцці таго, што было дасягнута ў выніку работы па праграме «Дванаццаць крокаў».

**Ці можна прыйсці на сход са сваяком?**

Існуюць «адкрытыя» сходы, куды могуць завітаць і члены сям'і, і сябры алкаголіка. Інфармацыю на гэтую тэму можна атрымаць на сайце www.aabelarus.org або па нумарах:

Мінск (+375 29) 276 83 17
Брэст (+375 29) 207 84 71
Віцебск (+375 33) 696 45 88
Гомель (+375 29) 230 90 40
Гродна (+375 29) 583 69 51
Магілёў (+375 29 849 79 40)
Слонім (+375 29) 280 21 79
Шчучын (+375 29) 285 68 70

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■

# ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ПАДПІШЫСЯ НА «ЗВЯЗДУ»

**I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

1. Рэкламная гульня пад назвай «Падпішыся на «Звязду» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 20 лютага па 30 чэрвеня 2014 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал 2014 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

**II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ**

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт. з ПДВ (руб.) | Усяго з ПДВ (руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Электрапрас Bosh TDA2315 CCBD5, РФ | 7 | 330 000 | 2 310 000 |
| 3. | Тэлевізар Sumsung UE32F4020AWXRU, РФ | 1 | 3 699 000 | 3 699 000 |
| УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» складае 6 009 000 (Шэсць мільёнаў дзевяць тысяч) беларускіх рублёў. | | | | |

**III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ**

4. Рэкламная гульня «Падпішыся на «Звязду» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал 2014 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2014 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас установы ў перыяд падпіснай кампаніі на другі квартал 2014 года выразаная з газеты або з укладыша ў газету запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце «Звязда» да двух разоў на тыдзень у перыяд з 20 лютага па 5 красавіка 2014 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або дасланыя пасля 9 красавіка 2014 года (па паштовым штэмпелі атрымання), да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

**IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ**

9. Для правядзення Гульні ўстанова стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Міхайлічэнка Алена Віктараўна — загадчык аддзела падпіскі і перспектыўных праектаў рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзьеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Сянько Аляксандр Анатольевіч — спецыяліст 1 катэгорыі адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Камісія кіруецца ў сваёй дзейнасці рэгламентам (раздзел V гэтых Правілаў).

11. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

**V. РЭГЛАМЕНТ РАБОТЫ КАМІСІІ**

12. Камісія ажыццяўляе кантроль за захаваннем вызначаных правілаў правядзення рэкламнай гульні, вызначае пераможцаў Гульні, якія выйгралі прыз, разглядае скаргі і спрэчныя пытанні, якія ўзнікаюць падчас правядзення Гульні.

13. Пасяджэнні Камісіі вядзе старшыня. Пасяджэнні Камісіі з'яўляюцца правамоцнымі пры наяўнасці большасці членаў з яе зарэгістраванага складу.

14. Члены Камісіі абавязаны: прымаць удзел у пасяджэннях Камісіі, забяспечваць падчас Гульні адпаведнасць парадку яе правядзення гэтым Правілам, вызначыць пераможцаў Гульні, якія выйгралі прызы, прымаць удзел у разглядзе скаргаў (пры іх наяўнасці) удзельнікаў, падпісваць пратаколы пасяджэнняў Камісіі.

15. На пасяджэнне Камісіі ў якасці назіральнікаў без права галасавання могуць запрашацца ўдзельнікі Гульні, прадстаўнікі незалежных арганізацый.

16. Усе рашэнні Камісіяй прымаюцца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў старшыні і членаў Камісіі, якія прысутнічалі на пасяджэнні. У выпадку роўнасці галасоў «за» і «супраць» голас старшыні Камісіі з'яўляецца вырашальным.

17. Рашэнні Камісіі афармляюцца пратаколам, які падпісваецца ўсімі прысутнымі на пасяджэнні членамі Камісіі.

**VI. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ**

18. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 11 красавіка 2014 года ў 12 гадзін у памяшканні ўстановы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

19. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

20. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца па адным электрапрасе.

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз — тэлевізар.

21. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні або прадстаўнікоў незалежных арганізацый. На кожнай такой картцы ўдзельніка пазначаецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

22. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 21 красавіка 2014 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 21 красавіка 2014 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

**VII. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ**

23. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2014 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2014 года.

24. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2014 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

25. Прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін па 30 чэрвеня 2014 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, за выключэннем выхадных і святочных дзён. Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза, установа не аплачвае.

26. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

27. Пасля 30 чэрвеня 2014 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

**VIII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

28. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

29. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны ўстановай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць установе.

30. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

31. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 287 18 38.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі рэкламнай гульні № 2302 ад 13.02.2014 г. выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

Шукайце картку ўдзельніка гульні ў бліжэйшых нумарах газеты!

# АДЧУЦЬ ДАВЕР І ДАПАМАГЧЫ

## Гомельскія католікі пагадзіліся на тое, каб пасля смерці іх органы выкарыстоўвалі ў трансплантaлогіі

**Акцыя, якая адбываецца ў гомельскім касцёле Нараджэння Божай Маці, ужо выклікала жывы інтарэс у інтэрнэце. Але пакуль нехта разважае аб гэтай ініцыятыве, жыхары горада над Сожам запаўняюць адмысловыя карткі, каб пасля смерці сваякі выканалі іх волю — дазволілі перасадку органаў тым, хто мае ў гэтым патрэбу. І як кажа ксёндз Славамір Ласкоўскі, пробашч тамтэйшай парафіі, такіх «фармуляраў» хапае.**




— Ідэя ўзнікла ў верніка Паўла Міцкевіча, а ўжо пасля нашу справу благаславіў дапаможны епіскап Пінскай дыяцэзіі Казімір Велікаселец, — узгадвае айцец Славамір. — Рэзананс адчуваецца. Нам ужо тэлефанавалі з радыё, тэлебачання. Званілі гомельскія трансплантолагі, якія, безумоўна, таксама зацікаўлены ў гэтай акцыі. І вельмі прыемна, што наша ініцыятыва стала справай не толькі католікаў.

Цалкам падтрымлівае жаданне гомельскіх вернікаў і **Алег РУМО, кіраўнік Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак, галоўны пазаштатны трансплантолаг Міністэрства аховы здароўя Беларусі.**

— Аб акцыі я даведаўся загадзя. Да мяне звярнуліся з Пінскай дыяцэзіі, каб я выказаўся аб мэтазгоднасці ініцыятывы. Не вітаць падобны крок я проста не мог. Больш за тое, ідэя беларускіх католікаў выказвае пазіцыю ўсяго Касцёла, які падтрымлівае донарства, лічыць гэта богаўгоднай справай. Чалавек не аддае душу. Ён аддае тое, што на нябёсах яму ўжо не спатрэбіцца. Затое спатрэбіцца тым, хто яшчэ можа пажыць на гэтым свеце. Католікі заўжды ладзяць падобныя акцыі. І не дзіўна, што самы высокі ўзровень развіцця донарства сёння ў такіх краінах, як Іспанія, Аўстрыя, Італія, дзе каталіцтва з'яўляецца галоўным веравызнаннем.

Праўда, жаданне вернікаў не мае юрыдычнай сілы. Чаму? У Беларусі, як у Бельгіі, Аўстрыі, Венгрыі, дзейнічае прэзумпцыя згоды. Паводле яе, неабходна ўлічваць правы тых, хто не згодны, каб іх органы пасля смерці не выкарыстоўвалі ў донарстве. І вось той, хто не згодны, павінен дзеля гэтага напісаць адмову, паведаміць у адзіны рэгістр. Дарэчы, сваякі таго, хто пры жыцці пагадзіўся на трансплантацыю, могуць пасля смерці не пагадзіцца на перасадку органаў. Згодна з законам мы павінны прыняць іх рашэнне. Смерць блізкага для кожнага — стрэс. І людзі часам на эмоцыях прымаюць тыя рашэнні, якія пасля змянілі б. Карткі, якія запаўняюць у Гомелі, павінны адлюстраваць волю і жаданне чалавека. Мяркую, што пры яе наяўнасці сваякі не будуць супраць трансплантацыі.

**— Алег Алегавіч, а ці супрацоўнічаеце вы з Праваслаўнай царквой?**

— Пасля таго, як мы выканалі першую аперацыю па трансплантацыі печані, Уладыка Філарэт адзначыў працу нашага калектыву найвышэйшымі ўзнагародамі Беларускай праваслаўнай царквы. Калі мы пачалі праводзіць аперацыі па трансплантацыі дзецям, нас узнагародзілі паўторна. Мяне — ордэнамі свяціцеля Кірылы Тураўскага II ступені і Крыжа прападобнай Еўфрасінні, ігуменні Полацкай. Я стаўлюся да гэтых медалёў як да прызнання БПЦ нашай справы.

**— Колькі людзей у Беларусі сумленна пагадзіліся на трансплантацыю органаў пасля смерці?**

— Правільней казаць аб колькасці нязгодных, тых, хто адмовіўся стаць донарам пасля смерці. Такіх у рэгістры сёння 2200 чалавек. Безумоўна, колькасць з кожным годам будзе крыху мяняцца. Але для нашай краіны рэгістр павінен складацца прыкладна з 5 тысяч чалавек.

**— Якія органы найбольш запатрабаваныя ў трансплантaлогіі?**

— Па ўсім свеце найчасцей перасаджваюць ныркі. Звязана гэта з тым, што чалавек можа пэўны перыяд жыць без іх на дыялізнай тэрапіі. Аднак тыя, у каго не працуе печань, проста не жывуць.

**— Як жыхары нашай краіны сёння ставяцца да трансплантaлогіі?**

— Лічу, што пазітыўна. Людзі проста разумеюць, што здарыцца ў жыцці можа насамрэч усё. У пэўны момант мы можам стаць і донарамі, і рэцэпіентамі. І калі патэнцыяльныя донары будуць адмаўляцца, рэцэпіенты будуць паміраць. Уявіце, смерць аднаго донара і адмова ад трансплантацыі прывядзе да смерці 4–5 чалавек. Ён памёр, але мог пакінуць ныркі, падстраўнікавую залозу, сэрца, печань для выратавання іншага, аднак не зрабіў гэтага…

Наогул узровень развіцця трансплантaлогіі ў краіне адлюстроўвае ўзровень даверу людзей да медыцыны. Калі чалавек не верыць медыцыне, ён будзе прытрымлівацца поглядаў, якія супярэчаць донарству. Так, мы не самая лепшая краіна ў трансплантaлогіі. Аўстрыйцы, амерыканцы працуюць лепш за нас. Мы перагналі Польшчу, знаходзімся амаль на адным узроўні з Германіяй. Праўда, гэта сведчыць толькі аб тым, што мы адштурхнуліся ад тых краін, дзе ёсць недавер у сістэме аказання медыцынскай дапамогі.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

# ЗАХАВАЕМ ТАПОНІМЫ НА МОВЕ

**Дзяржкаммаёмасці Беларусі прапануе захаваць найменні геаграфічных аб'ектаў на беларускай мове**

Літаральна ў мінулым нумары нашай газеты быў надрукаваны матэрыял Ніны Шчарбачэвіч «Я на Крынічнай. А дзе Радніковая?». У ім узнімалася праблема беларускіх тапонімаў:

«Згодна са зменамі, якія хочуць унесці ў заканадаўства, назвы геаграфічным аб'ектам у нашай краіне можна будзе даваць не толькі па-беларуску (як цяпер), але і па-руску. Такі крок, калі ён будзе прыняты, можа пацягнуць за сабой не толькі страту нацыянальнай тапаніміі, але і значныя расходы з дзяржаўнага бюджэту і блытаніну ў назвах, асабліва недапушчальную сёлета, у Год гасціннасці».

А гэтымі днямі сваю пазіцыю на гэты конт выказаў Дзяржаўны камітэт па маёмасці, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе гэтага ведамства:

«Дзяржаўны камітэт па маёмасці Рэспублікі Беларусь прапануе зацвердзіць у Законе прысваенне найменняў геаграфічным аб'ектам на беларускай мове. Праект рэдакцыі артыкула 17 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб найменнях геаграфічных аб'ектаў» Дзяржкаммаёмасцю быў перагледжаны з улікам аналізу зваротаў грамадзян, прапаноў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь. Дзяржкаммаёмасць выказвае падзяку грамадзянам, якія неабыякава ставяцца да пытання нацыянальнай тапаніміі і аховы геаграфічных назваў як гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі».

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ДА СУСЕДЗЯЎ — З ДОБРЫМ СЛОВАМ

## Экспазіцыя беларускіх кніг будзе прадстаўлена на Вільнюскім міжнародным кніжным кірмашы

**Кірмаш пройдзе 20–23 лютага ў Літоўскім выставачным і кангрэс-цэнтры Litexpo, паведамілі БелТА ў пасольстве Беларусі ў Літве.**

Удзел Беларусі ў гэтым форуме (ён ужо 15-ы па ліку) стаў добрай традыцыяй. Вільнюскі кніжны кірмаш — найбуйнейшы ў краінах Балтыі — збярэ прадстаўнікоў многіх дзяржаў. У праграме кірмашу розныя культурныя мерапрыемствы, сустрэчы аўтараў з чытачамі. Сярод удзельнікаў — выдавецтвы, прадаўцы кніг, калектыўныя стэнды замежных дзяржаў, навуковыя інстытуты, выдавецкія цэнтры вышэйшых навучальных устаноў, грамадскія арганізацыі, сродкі масавай інфармацыі, музеі і галерэі.

На нацыянальным стэндзе Беларусі будуць экспанавацца кніжныя навінкі дзіцячай, вучэбнай, навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры. Сваю прадукцыю прадставяць выдавецтва «Белкніга», «Пачатковая школа», «Адукацыя і выхаванне», Выдавецкі дом «Звязда», «Вышэйшая школа» і інш. Адкрыццё нацыянальнага стэнда з удзелам пасла Беларусі ў Літве Аляксандра Караля адбудзецца 20 лютага.

■ Фестывалі

# Музыкі, якія выступаюць сумленна

**III Міжнародны фестываль «Уладзімір Співакоў запрашае» адкрыўся ўчора ў Палацы Рэспублікі сумесным канцэртам народнага артыста Расіі Дзмітрыя Хварастоўскага і Нацыянальнага філарманічнага аркестра Расіі, што ўжо само па сабе робіць падзею адметнай.**

— Такое адкрыццё фестывалю стала б падзеяй не толькі для Мінска, але для любой краіны свету, — гаворыць маэстра Уладзімір Співакоў. — З Дзмітрыем нас звязвае шматгадовае сяброўства. Мы разам выступалі ў Маскве, Амерыцы, Люксембургу. Даўно і шчыра любім адзін аднаго як творцы і па-чалавечы — гэта вельмі важна для сумесных выступленняў.

— …Гадоў пяць не музіцыравалі разам, таму, калі даведаўся, што ёсць такая магчымасць, адразу пагадзіўся, — прызнаўся напярэдадні адкрыцця фестывалю Дзмітрый Хварастоўскі. — Тым больш што ў Мінску я бываў шмат разоў, для мяне гэта заўсёды вялікая радасць — сустракацца са слухачамі, якія мяне ведаюць… Зараз у мяне праходзіць тур з 21 канцэрта, і я знаходжуся прыкладна на сярэдзіне. Я заўсёды любіў і люблю канцэртную дзейнасць. Але свядома падзяліў сваю кар'еру на дзве вялікія значныя паловы: оперную і канцэртную. На працягу стольких гадоў жыцця мне ўдаецца іх сумяшчаць. Я шчаслівы, што ёсць магчымасць вар'іраваць віды дзейнасці, і маё творчае «я» можа адпачываць такім чынам.

— Але мы людзі сумленныя, і ў першы ж дзень прыезду Дзмітрыя ў Мінск, нягледзячы на яго стомленасць, мы ўжо правялі рэпетыцыю, — удакладніў Співакоў.

Пасля канцэрта народны артыст Расіі Дзмітрый Хварастоўскі затрымаўся ў Мінску яшчэ на адзін дзень: дзеля таго, каб сёння даць майстар-клас для студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

Што адметна, беларускіх маладых таленавітых музыкантаў адзначае і Уладзімір Співакоў, які часам бярэ іх да ўдзелу ў свае канцэрты. Раней увагу маэстра заслужылі, у прыватнасці, віяланчэліст Іван Карызна, скрыпач Арцём Шышкоў і оперная спявачка Аксана Волкава. Яе, дарэчы, адзначыў і Хварастоўскі, якому выпала разам спяваць у спектаклі «Рыгалета» аднаго з вядучых тэатраў свету «Метраполітэн опера», што ў Нью-Ёрку. Як высветлілася, беларуская спявачка працуе з тым жа менеджарам, што і Хварастоўскі, які падумае пра тое, каб запрасіць Аксану Волкаву на свой фестываль…

У праграме фэсту «Уладзімір Співакоў запрашае» шэраг адметных канцэртаў. Адзін з іх называецца «Час Баха», маэстра вызначыў для яго ўмоўны дэвіз: «Палюбі свет». На яго думку, Іаган Себасцьян Бах — гэта творца, які змяшчае ў сабе не адзін сусвет, а шмат. Кампазітар і музыкант самааддана служыў Богу, у канцэрце прагучаць яго творы на духоўныя тэмы, у тым ліку са словамі з Нагорнай пропаведзі Ісуса Хрыста. Гэтую праграму некалькі разоў давалі ў Францыі. І, што цікава, аднойчы нават на эканамічным форуме ў Давосе. «Свет так уладкаваны, што трэба падтрымліваць адзін аднаго, каб не апынуцца ў беспаветранай прасторы. Трэба дапамагаць адзін аднаму дыхаць», — тлумачыць Співакоў.

У Гомелі і Магілёве прадставяць праграму «Час Чапліна», з якой Мінск пазнаёміўся на мінулым фестывалі. Прысутным на гэтых канцэртах нагадаюць бессмяротную класіку нямога кіно «Агні вялікага горада» — праз музыку да яго.

**Удзельнікаў фестывалю павіншаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА. «Гэтае цудоўнае свята мастацтва выконвае важную місію захавання традыцый і ідэалаў класічнай музыкі, умацавання сяброўства і згоды паміж народамі», — гаворыцца ў віншаванні.**




Фота БЕЛТА.

Партытура была рэканструявана ў 2004 годзе. Мінск і Віцебск будуць мець магчымасць паглядзець на «Зорак сусветнага балета». Яшчэ ў адным канцэрце ў суправаджэнні Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь выступіць піяніст Аркадзь Валадось. На закрыцці ў Белдзяржфілармоніі можна пачуць салістаў Вялікага і Марыінскага тэатраў Расіі Ганну Аглатаву, Васіля Гарэла, Алега Кулько.

— Геаграфія фестывалю пашыраецца: сёлета, акрамя Магілёва і Гомеля, да яе дадаецца горад Віцебск, — адзначае Максім Берын, прадзюсар і арганізатар мерапрыемства. — Мы ладзім яго без удзелу дзяржаўных сродкаў, часткова за грошы, атрыманыя ад продажу квіткоў, а таксама дзякуючы спонсарам. Але пры падтрымцы дзяржавы. Права на здымкі канцэрта адкрыцця атрымаў тэлеканал АНТ.

Трэба адзначыць, што фестываль «Уладзімір Співакоў запрашае» ладзіцца яшчэ ў Маскве і ў французскім горадзе Кольмары. У Беларусі першыя канцэрты гэтага фестывалю адбыліся ў 2010 годзе.

Сёлета III Міжнародны фестываль «Уладзімір Співакоў запрашае» праходзіць у Мінску з 18 па 28 лютага. На думку намесніка міністра культуры Беларусі Васіля Чэрніка, у гэтыя дні «цэнтр сусветнай культуры перасоўваецца ў Мінск».

**Ларыса ЦІМОШЫК**

# Вас вітае свята ліхтароў!

**Днямі ў сталічным Ліцэі БДУ гучалі віншаванні з традыцыйным кітайскім святам Юаньсяоцзе. Гэтае свята ліхтароў сімвалізуе завяршэнне навагодніх урачыстасцяў і пераход да плённых будных дзён.**



Гледачы ўзнагароджвалі апладысментамі ўсіх удзельнікаў канцэрта. На пярэднім плане прарэктар БДУ па навуковай рабоце Алег Івашкевіч і пасол Кітая ў Рэспубліцы Беларусь Цуй Цімін.



Выканаўцы жартоўных кітайскіх прыпевак — студэнты БДУ Аляксандра Дударэнка і Дзяніс Караяні.

Добры сімвал. Тым больш што культурныя і эканамічныя адносіны паміж Рэспублікай Беларусь і Кітаем няспынна мацнеюць і прыносяць добры плён. Такімі словамі можна коратка перадаць тэму выступленняў ганаровых гасцей свята — пасла Кітая ў Беларусі Цуй Ціміна і прарэктара па навуковай рабоце Белдзяржуніверсітэта, акадэміка Алега Івашкевіча. Іх прамовы перад удзельнікамі святкавання суправаджаліся яскравым слайд-шоу: на вялікім экране ажывалі знакавыя падзеі сучаснай гісторыі Кітая, хроніка развіцця нашых узаемаадносін.

Юаньсяоцзе мае старажытныя карані: гэтае свята адзначалі яшчэ за сотні гадоў да нашай эры. Прычым за мінулыя тысячагоддзі змянілася шмат яго атрыбутаў. Нязменнай засталася абавязковая прысутнасць каляровых ліхтароў — сімвалаў святла і дабрыні.

Менавіта такімі ліхтарамі была ўпрыгожана сцэна Ліцэя БДУ. Пра канцэртную праграму паклапаціліся ліцэісты, студэнты мінскіх ВНУ і галоўныя носьбіты свята — кітайскія юнакі і дзяўчаты, якія вучацца ў Мінску. Песні і танцы, фальклорныя сцэнічныя эцюды выканалі маладыя мінчане, якія вывучаюць кітайскую мову.

**Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.**




Каляровыя ліхтары ў зале — сімвал свята.



Якое ж свята без паказальных выступленняў майстроў баявога мастацтва ўшу!



■ Тэатральнае паляванне

# «ГЭТЫ ДЗІВАК УСЁ РОБІЦЬ НЕ ТАК…»

**Словы паводле гэтай няхітрай песенькі Андрэя Макарэвіча вельмі дакладна адпавядаюць сітуацыі, якая цяпер актыўна абмяркоўваецца ў тэатральным свеце: куды падзеліся маладыя рэжысёры? Навучальныя ўстановы іх штогод выпускаюць, а тэатры стогнуць праз адсутнасць граматных пастаноўшчыкаў.**

Упэўнена: у Беларусі ёсць маладыя таленавітыя рэжысёры. Думаю нават, што яны ёсць не таму, што іх вучылі ў ВНУ. Хоць і гэта мае вялікае значэнне. Проста, калі чалавек заняўся рэжысурай невыпадкова (яна сёння паўсюдна запатрабавана), ён, урэшце, сябе праявіць. Але ёсць абставіны, якія ў нас перашкаджалі заўсёды і працягваюць перашкаджаць рэалізоўвацца самабытнай рэжысёрскай асобе.

Першая прычына: кожны малады рэжысёр марыць стварыць свой тэатр, каб творча ўвасобіць свае ідэі. Аднак не так часта з'яўляюцца новыя тэатры, за якімі няма спонсараў, рэкламы, глядацкай цікавасці. Гэта вялізны падрыхтоўчы працэс, для якога неабходны грошы, памяшканне, энтузіясты і зацікаўленасць афіцыйных структур.

Другая прычына, хутчэй, маральнага характару. Малады рэжысёр ставіць спектакль у дзяржаўным рэпертуарным тэатры і атрымлівае адмоўныя водгукі. Справа нават не заўсёды ў тым, што яго работа слабая або маламастацкая. Спектакль можа быць не прыняты праз новую эксперыментальную форму. Праз «непападанне» ў стыль тэатра, немагчымасць прадаць яго гледачу, адсутнасць узаемаразумення ўнутры трупы паміж рэжысёрам і акцёрамі. Як вынік — расчараванне, нявер'е ў свае сілы, нават сыход маладога рэжысёра з прафесіі.

Тут вельмі важна, каб малады рэжысёр не быў адзінокім воўкам, каб ён быў лідарам, у яго была армія, яшчэ дакладней — аднадумцы. Тады лягчэй прабівацца да перамогі.

Рэпертуарныя дзяржаўныя тэатры пастаянна дэкларуюць сваё жаданне прыняць у калектыў маладога рэжысёра. Але ў іх няма магчымасці і жадання чакаць. Ім патрэбны хуткі і, пажадана, паспяховы вынік. Аднак нават вядомыя майстры маюць права на памылку. Маладому ж такога карт-бланша не даюць. Яго прыпячатваюць адмоўнай характарыстыкай і выпіхваюць.

Вядома, магчымыя пярэчанні: а дзе асабістая ініцыятыва, дзе сіла волі, цвёрды характар, імкненне да перамогі? Не грэх нагадаць, што прафесія рэжысёра не з тых, якой можна навучыць у ВНУ. Ёй можна навучыцца. Ёю можна авалодаць з гадамі, з набыццём жыццёвага і творчага вопыту. Малады рэжысёр можа быць сярэдняга ўзросту, калі за спінай салідны шлях пошуку і знаходак, веданне чалавечай псіхалогіі і ўменне натхніць акцёраў, павесці за сабой.

Цяпер у Беларусі шырока вядомыя ў вузкіх тэатральных колах некалькі сур'ёзных імёнаў, якія вымушаны працаваць на полі прыватнай тэатральнай справы. Гэта Наталля Родзіна, Сяргей Анцылевіч, Таццяна Траяновіч. Частка маладых рэжысёраў пайшла з тэатра на тэлебачанне, у шоу-бізнес, паехала ва Украіну, дзе нашых заўсёды ахвотна прымаюць і забяспечваюць цікавай працай. Нікому лягчэй і спакайней ад гэтага не стала, таму што змена пакаленняў — працэс непазбежны, і добра, калі малады талент сталее і праяўляе сябе пад крылом майстра.

У кожнага былі маладыя гады, праведзеныя пад кіраўніцтва Настаўніка. Некаторыя пасля з гонарам называюць «У мяне школа такога…». Цяпер, на жаль, замест шматкроп'я цяжка ўпісаць канкрэтнае прозвішча. Рэжысёраў у ВНУ даўно ўжо не вучаць вядомыя майстры, якія маглі б пахваліцца тым, што стварылі і маюць сваю школу. Часта настаўнікі знаходзяцца з ліку «збітых лётчыкаў», ужо не здольных абудзіць у вучнях дзейнасць розуму, уменне шукаць канцэптуальныя ключы для адкрыцця п'есы. Ды і п'есы маладыя рэжысёры часта выбіраюць зразумелыя ім, без жадання пранікнуць у мінулае або чужыя эмацыйныя і культурныя светы. Больш за тое, назіраю, што ў маладых рэжысёраў неяк згасла цікавасць да чалавека і інтэлектуальных варыяцый чалавечай прыроды. Ёсць аналіз уласных перажыванняў, калі шкада сябе, любімага. А далей закрылася каробачка. Іншых не шкада.

Цікава, што выключэнні з правілаў у нас у Беларусі цяпер праяўляюцца ў тэатрах лялек. Магчыма, таму, што большасць маладых «лялечных» рэжысёраў вучылася ў Аляксея Ляляўскага, трэнера, які ўмее навучыць, падштурхнуць і даць свабоду, каб рухацца далей. Так сфарміраваліся Аляксандр Янушкевіч, Ігар Казакоў, Святлана Бень.

Не перастаю чакаць і спадзявацца, што таленавітая моладзь прарве барыкады забабонаў і прадузятасці і яшчэ пакажа сябе.

**Таццяна АРЛОВА**



■ Дзённік настаўніка

# ХТО КАГО?

На жаль, такое здараецца. У кожным амаль класе (акрамя, можа, самых пачатковых) заўсёды знойдзецца адзін альбо некалькі вучняў, якія на ўроках паводзяць сябе горш, чым астатнія. Прычым, робяць гэта свядома і пастаянна…

Як настаўніку на такое рэагаваць?

Агульнага рэцэпта, вядома ж, не існуе, як не існуе і адзінай прычыны кепскіх паводзін вучня на ўроку. Бо ўсе магчымыя прычыны гэтага можна ўмоўна падзяліць на тры групы.

Часта (асабліва ў малодшых класах) вучні парушаюць дысцыпліну з адзінай мэтай: проста прыцягнуць да сябе ўвагу настаўніка. Для іх нават «сярдзітая» ўвага лепш, чым ніякай. Заўважана: чым менш увагі атрымлівае вучань у сям'і, тым большая верагоднасць дрэнных паводзін на ўроку. Але калі ў малодшых класах парушэнне дысцыпліны вучнем накіравана толькі на настаўніка, то ў сярэдніх (тым больш у старэйшых) класах такім вучням для прыцягнення ўвагі патрэбна ўжо больш шырокая аўдыторыя: не толькі настаўнік, але і аднакласнікі.

Другая прычына — завышаная самаацэнка і, як вынік, імкненне да лідарства ў класе, імкненне быць першым хоць у чым. З вучобай у такіх дзяцей, як правіла, не вельмі, са спортам яны таксама не асабліва сябруюць… Застаецца адзіны спосаб самаўзвышэння: даказаць усяму класу сваю незалежнасць ад настаўнікаў.

Такія вучні не проста дрэнна паводзяць сябе на ўроку. Яны ўвесь час як бы кідаюць выклік, правакуюць, не рэагуюць на заўвагі, дэманстратыўна і адкрыта гуляюць з мабільнымі тэлефонамі, жуюць жуйку і г. д і да т. п. Спробы настаўніка хоць неяк перашкодзіць гэтым іх дзеянням могуць выклікаць у адказ вельмі бурную рэакцыю: ад слёз і істэрыкі (гэта часцей у дзяўчат) да абраз і непрыхаванай агрэсіі…

І, нарэшце, трэцяя прычына — элементарная помста. Вучань дрэннымі сваімі паводзінамі на ўроку быццам помсціць настаўніку (а часта — і аднакласнікам) за боль і крыўду, якія нанёс яму хтосьці іншы: бацька, старэйшы брат, больш моцны падлетак з суседняга двара. Адпомсціць сваім крыўдзіцелям падлетак пакуль не ў стане, а настаўнік — вось ён, побач! Самая падыходзячая «мішэнь»!

Але якімі б ні былі сапраўдныя мэты і матывы, настаўнік павінен неяк рэагаваць на гэта, асабліва калі вучань дэманстратыўна зрывае ўрок.

Самае першае і самае галоўнае: кантраляваць свае адмоўныя эмоцыі!

А яны, эмоцыі, могуць біць цераз край. І гэта нармальная чалавечая рэакцыя, бо вучань знарок разбурае вучэбны працэс, перашкаджаючы працаваць і вам, і класу. Так і хочацца выказаць гэтаму нягодніку ўсё, што на душы накіпела, а лепш і наогул — схапіць яго за шкірку, добранька так трасянуць…

І толькі потым, са спазненнем усвядоміць, што менавіта такой рэакцыі ён і чакаў. І дабіўся свайго. А значыць, менавіта ён (а не вы) выйшаў пераможцам з вашага ўмоўнага «паядынку». І на наступным уроку сітуацыя можна паўтарыцца адзін да аднаго…

Так што, як бы там ні было, а эмоцыі прыйдзецца стрымліваць. І не толькі эмоцыі…

Кпіны ў адказ на здзеклівую рэпліку вучня таксама не прыбавяць вам аўтарытэту, як і высмейванне яго знешняга выгляду, перадражніванне манеры размаўляць, прыцягненне да вашага ўзаемнага канфлікту іншых вучняў класа, тым больш іншых настаўнікаў… Усё гэта можа падзейнічаць на нейкі кароткі час… але вынік той будзе, хутчэй за ўсё, кароткатэрміновым…

Для пачатку пастарайцеся ўсвядоміць, чаму вучань так сябе паводзіць, і пастарайцеся даць яму зразумець, што вы яму не вораг, што вы ставіцеся да яго з такой жа павагай (і ўвагай), як і да ўсіх астатніх у класе. І ўсё гэта — спакойным добразычлівым тонам… Гэтым вы як бы перахопліваеце ініцыятыву ў парушальніка дысцыпліны: ён жа падсвядома чакае вашых агрэсіўных дзеянняў у адказ, а іх няма! Значыць, уся яго бравада не дасягнула мэты…

Зразумела ж, даваць парады лёгка, а вось што датычыцца канкрэтнага іх выканання…

Тут столькі нюансаў: і асаблівасці псіхікі самога парушальніка, і ўзаемаадносіны яго з іншымі вучнямі класа, і стаўленне да вашага прадмета… Ды хіба ж усё пералічыш?

І ўсё ж стрымлівайце эмоцыі! Гэта галоўнае… А ўсё астатняе, як той казаў, прыкладзецца…

**Генадзь АЎЛАСЕНКА**

## ОАО «Брестский радиотехнический завод»

**Наблюдательный совет ОАО «БРТЗ» сообщает:**
**21 марта 2014 года в помещении заводоуправления**
**по адресу: г. Брест, ул. Московская, 248**
СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2013 год. Утверждение показателей социально-экономического развития Общества на 2014 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2013 году.
3. О результатах аудита и проверки ревизионной комиссией финансовой и хозяйственной деятельности Общества, распределение прибыли и убытков Общества за 2013 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2013 год.
5. Об утверждении распределения и использования прибыли и убытков, выплате дивидендов за 2013 год.
6. Утверждение направлений распределения прибыли на 2014 год.
7. Об избрании членов наблюдательного совета, его составе и ревизионной комиссии Общества.
8. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

**Начало собрания в 14.00.** **Начало регистрации в 13.00.**

Акционеры могут участвовать в собрании лично или через своих представителей, имеющих нотариально оформленные доверенности.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность.

**Справки по тел. (8-0162) 42-14-05, факс 42-51-59.**

УНН 200273907 *Наблюдательный совет.*

## ОТЧЕТ
## Местного благотворительного Фонда «Сила добра» об использовании своего имущества за 2013 год

Местный благотворительный Фонд «Сила добра» информирует о продолжении своей деятельности согласно Уставу по адресу: г. Могилев, Загородное шоссе, 43-5, а также сообщает о том, что по состоянию на 1 января 2014 года баланс фонда составил 3 500 000 рублей.

В том числе: стоимость имущества Фонда составляет — 3 500 000 рублей, сформировано за счет взносов учредителей Фонда при его учреждении.

В 2013 году деятельность фонда, направленная на достижение уставных целей, велась на добровольных началах. Проводилась подготовительная работа для вовлечения широкого круга физических и юридических лиц в благотворительную деятельность, велся поиск спонсоров для оказания помощи онкологическим больным, а также велась разъяснительная работа среди населения для организации сбора пожертвований.

Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах, созданных для осуществления предпринимательской деятельности.

УНП 790770920

УНП 194900098.

## ОТЧЕТ
## местного фонда «Правопорядок Заводского района г. Минска» об использовании своего имущества за 2013 г.

Учредителем Фонда является администрация Заводского района г. Минска.

Поступления от проводимых в соответствии с уставом фонда мероприятий (безвозмездная (спонсорская) помощь, целевые поступления от организаций и предприятий района) составили 142675488 белорусских рублей.

Сумма расходов, понесенных фондом на осуществление деятельности, направленной на содействие по обеспечению правопорядка, безопасности дорожного движения и других общественно полезных целей, указанных в Уставе Фонда, составила 146301845 белорусских рублей.

Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах и коммерческих организациях.

Справку, выданную ООО «Белграндлайт» Глинскому Руслану Петровичу, 1973 г.р., проживающему по адресу: г. Минск, ул. Колесникова, 18, кв. 82, заверенную печатью организации и подписью директора, **считать недействительной.**

УНП 192172360

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот № 1.** Полуприцеп самосвальный тракторный ПСТ-9, гос. № ВВ-2 1050, первоначальная стоимость 25 942 000 белорусских рублей.<br>**Лот № 2.** Трактор Беларус 952, 2008 г.в., гос. № ВВ-2 1047, первоначальная стоимость 40 180 000 белорусских рублей.<br>**Лот № 3.** Трактор Беларус 952, 2008 г.в., гос. № ВВ-2 1046, первоначальная стоимость 40 180 000 белорусских рублей.<br>**Лот № 4.** Коровы (22 головы), первоначальная стоимость 146 791 540 белорусских рублей.<br>**Лот № 5.** Коровы (8 голов), первоначальная стоимость 57 015 576 белорусских рублей.<br>**Лот № 6.** Коровы (36 голов), первоначальная стоимость 267 693 984 белорусских рубля. |
| **Собственник (владелец) имущества** | КФХ «Дубрава» |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Витебский район, д. Присушино, ферма КФХ «Красника» |
| **Информация об обременениях** | Арест хозяйственным судом Витебской области (залог ОАО «Белагропромбанк») |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Витебск, ул. Правды, д. 32, каб. 323<br>6 марта 2014 года в 10.00 |
| **Справочная информация** | Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома, г. Витебск, ул. Правды, д. 34<br>Заместитель начальника отдела Коржов Алексей Игоревич, тел./факс (80212) 60 09 09.<br>Начальник отдела — Бураков Игорь Вячеславович, тел. (80212) 60 09 75. |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) не позднее 05.03.2014 на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебска, МФО 635, УНП 300002505.<br>Минимальная величина первого шага — 5% стоимости каждого лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

**Уважаемые акционеры**

## ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат»!

**Во Дворце культуры Слуцкого сахарорафинадного комбината по адресу: г. Слуцк, ул. Головащенко, 6,**
**25 марта 2014 года в 15.00**
**СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ ГОДОВОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ открытого акционерного общества «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Отчет о результатах деятельности Общества за 2013 год и направлениях развития на 2014 год:
   - Отчет Дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности в 2013 году и основных направлениях деятельности Общества на 2014 год;
   - Отчет Наблюдательного Совета ОАО о проделанной работе в 2013 году;
   - Отчет Ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии в 2013 году и заключение по бухгалтерскому балансу, отчету прибылей и убытков, годовому отчету Общества;
   - Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках за 2013 год с учетом аудиторского заключения;
   - Утверждение распределения чистой прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2013 г.
2. Утверждение направлений использования чистой прибыли Общества на 2014 год.
3. Утверждение размера, порядка и сроков выплаты дивидендов за 2013 год, порядка и сроков выплаты дивидендов по 2014 году.
4. Утверждение размера, условий вознаграждения и компенсации расходов за исполнение своих обязанностей членам Наблюдательного Совета и Ревизионной комиссии.
5. Избрание членов Наблюдательного Совета и Ревизионной комиссии Общества.

Список акционеров, имеющих право на участие в собрании, составляется на 01.03.2014 года.

Регистрация акционеров и их представителей будет осуществляться в день проведения собрания с 13.00 до 14.00 по месту его проведения.

Представителям акционеров при регистрации иметь паспорт, доверенность, оформленную в установленном порядке, акционерам – паспорт.

***Информацию (материалы) по вопросам повестки дня можно получить:***

- в рабочие дни – с 8.00 до 17.00 по месту нахождения Общества, начиная с 17 по 24 марта 2014 года (тел. 4-53-28);
- в день проведения собрания – по месту его проведения.

**Дирекция, Наблюдательный Совет ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».**

УНН 600075003

## ОАО «НАФТАН»

**реализует на конкурсной основе** (с повышением начальной цены) **бывшее в употреблении неиспользуемое имущество:**

| Наименование конкурса (пометка на конверте) | Наименование | Инв. № | Год выпуска | Начальная цена с НДС, руб.РБ | Конечный срок предоставления предложений |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. Реализация неликвидов. Полуприцепы | Полуприцеп МАЗ 9758-012 | 13150621 | 2002 | 32 400 000 | 20.03.2014 |
| | Полуприцеп МАЗ 975800 | 13151036 | 2004 | 60 000 000 | |
| | Полуприцеп МАЗ 9758 012 | 13151032 | 2004 | 42 600 000 | |
| 2. Реализация неликвидов. Мазы | Автомобиль МАЗ 54323-032 | 13151245 | 1995 | 54 000 000 | |
| | Автомобиль МАЗ 6303 | 13151014 | 1998 | 122 400 000 | |
| 3. Реализация неликвидов. Спецтехника | Экскаватор-планировщик на шасси МАЗ 631705 | 04150930 | 2006 | 552 000 000 | |
| | Автокран КС-3579 (МАЗ 5337) | 06280636 | 1996 | 192 000 000 | |
| 4. Реализация неликвидов. Культиватор | Культиватор к мини-трактору КТ-00200 | 15208972 | 2002 | 780 000 | |
| 5. Реализация неликвидов. Кран-балка | Электрическая кран-балка подвесная (таль) г/п 5 тн | 06152817 | 1995 | 5 040 000 | |

Состояние удовлетворительное.

Предложения принимаются по адресу: 211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени конечного срока предоставления предложений с пометками на конверте, указанными в таблице.

Извещения на проведение конкурса размещены на сайте **www.naftan.by.**

Контактные телефоны: 8(0214) 59-87-83, 8(0214) 59-89-26, 8(0214) 59-88-42, (033) 398 08 48, (033) 398 07 67.

УНП 300042199

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 25 марта 2014 года АУКЦИОНА по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Тюхиничи Мотыкальского сельского Совете Брестского района

| № лота | Местоположение земельного участка и его кадастровый номер | Площадь, га | Начальная (стартовая) стоимость земельного участка, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы по формированию и регистрации земельного участка и проведению аукциона, руб. | Целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|
